Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не варочаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародняя	— 20 к.
мясцовая	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок капнарэлі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок капнарэлі пасьлярод тэксту 1 р. — к.
За радок капнарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сьпешныя на 50 проц. даражэй.
Зьніж тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумэнт	35 кам.
За кожны дадатковы	15 „
Бесспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумэнт	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах.
АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА.

№ 26 (2214) Аўторак, 31-га студзеня 1923 г.

Напярэдадні выбараў ў Польшчы.

Выбарчая кампанія ў Польшчы ў поўным разгары. Польскі фашызм для таго, каб забясьпечыць сабе перамогу на надыходзячых выбарах у сойм, выкінуў, як непатрэбны хлам, нават тыя невялікія рэшткі законнасьці, якімі для вачыстці сумленьня ён часамі яшчэ кіраваўся ў сваёй палітычнай дзейнасьці. Калі Пілсудзкі пасьля захопу ўлады захаваў сойм замест таго, каб разагнаць яго, дык, зразумела, ён меў пры гэтым на ўвазе выкарыстаць для сваіх мэтаў гэту карыкатуру на парлямант.

Задача ўраду Пілсудзкага зьвяўляецца зараз у тым, каб сфабрыкаваць паслухмяны сойм, які ахвотна будзе накрываць сваім «аўтарытэтам» усе дзеі дыктатара. Але для гэтага неабходна, каб у сойм не прайшлі нават слабыя элемэнты апазіцыі. Для гэтай мэты пущчаны ў рух усе пружыны паліцэйскага і вайсковага мэханізму, адкрыта робіцца націск на выбаршчыкаў і арганізуецца „Урадавая партыя", у якую побач з рэакцыйнымі элемэнтамі з абшарніцкіх і прамысловых колаў уваходзяць і дробна-буржуазныя нацыяналісты з так званай «польскай сацыялістычнай партыі».

Але асабліва ўзмоцнены рэпрэсіі супроць рэвалюцыйных партый, справаваўшых афоризьм незадаволенасьці працоўных пластоў гарадоў і вёсак Польшчы.

Можна загадзя сказаць, што выбары відавочна закончацца посьпехам для Пілсудзкага і падначаленага яму фашысцкага блёку.

За паўтары гады сваёй дыктатуры Пілсудзкі здолеў разлажыць буржуазныя партыі, якія спачатку яму не давяралі і лічылі яго занадта «левым». Прышоўшы да ўлады, бравы маршал даказаў, што ён даўно ўжо забыў „памылкі" сваёй рэвалюцыйнай моладасьці.

З першых-жа дзён свайго кіраваньня Пілсудзкі зблізіўся з абшарнікамі-арыстократамі і пастараўся прыцягнуць у органы, кіруючыя прамысловасьцю і фінансамі краіны, прадстаўнікоў буйнага капіталу. Але асабліва заваяваў ён сэрца рэакцыйных колаў суровымі расправамі з сялянскімі і рабочымі рэвалюцыйнымі арганізацыямі і ўменьшэньнем зрываць забастоўкі пры дапамозе сацыялістаў, душою і целам адданых яму. Гэтай сваёй палітыкай Пілсудзкі дамагаўся развалу партый, аб'яднаючых раней зямельную арыстакратыю і прамысловую буржуазею, — нацыянальнай дэмакратыі, хрысьціянскай дэмакратыі, кансэрватыўных груп нямецкай і яўрэйскай буржуазеі і кулацкай партыі „Пяст". Усе актыўныя элемэнты гэтых партый перайшлі на бок Пілсудзкага і разам з польскімі сацыялістамі і няпэўнымі дэмакратамі з сялянскай партыі „Вызваленьне" складаюць зараз „урадавы лягер", іншымі словамі, адзіны фронт польскай буржуазеі пад агульным сьцягам фашызму.

Гэтаму адзінаму фашысцкаму фронту супрацьстаіць зараз толькі рабочасялянскі блёк, пад сьцягам якога аб'яднаюцца сапраўды левыя і рэвалюцыйныя элемэнты працоўных мас як карэннай Польшчы, так і ваколіц, населеных украінцамі і беларусамі. Камуністычная партыя Польшчы загнана ў падполье, але працоўныя масы давяраюць ёй больш, чымся ППС (польская сацыялістычная партыя), якая ператварылася ў дадатак фашысцкага ўраду Пілсудзкага. На нядаўніх выбарах у гарадзкія самакіраўніцтвы (муніцыпалітэты) за кандыдатаў рабочасялянскага блёку было пададзена ў прамысловых райёнах, ня выключаючы і Варшавы, больш галасоў, чым за ППС і іншыя сацыялістычныя групы. І гэта, ня гледзячы на паліцэйскія прасьледваньні, на арышты кандыдатаў, разгон сходаў, забароны афіш і папярэджаньне, што левыя сьпісы ўсё роўна будуць ануляваны.

Пры гэтых умовах нават перамога на выбарах у сойм рэакцыйных партый ні ў якім выпадку ня будзе азначаць паражэньня рэвалюцыі. Справа ня ў колькасьці мясцаў, якія заваюць у сойме рабочыя і сялянскія рэвалюцыйныя кандыдаты. Вялізарнае значэньне надыходзячых выбараў і распачатай выбарчай кампаніі зьмяшчаецца ў шырокай асьветнай працы, якая праводзіцца зараз у форме выкрываючай перадвыбарчай агітацыі. Урадавыя рэпрэсіі і барацьба ўсіх сіл буржуазнай і шляхецкай рэакцыі супроць працоўных мас гораду і вёскі зьяўляецца таксама дасканалым вурокам палітычнай пісьменнасьці, якой вельмі не хапае ня толькі польскаму сялянству, але і польскаму пралетарыяту. Выбарчая барацьба ў Польшчы набыла характар адкрытай клясавай барацьбы, і ў гэтым яе буйнае выхаваўчае значэньне.

БЛЁК ЧЭХАСЛАВАЦКІХ ЗГОДНІЦКІХ ПАРТЫЙ.

СПРОБЫ Ф. АДЛЕРА НАПАДКАМІ НА КАМПАРТЫЮ ПРЫКРЫЦЬ АДЫХОД ІІ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛУ АД КЛЯСАВАЕ БАРАЦЬБЫ.

ПРАГА, 29-1. Зьезд усіх сацыял-дэмакратычных партый Чэхаславакіі адчыніўся ўступнаю прамоваю Фрыдрыха Адлера, які заявіў, што значэньне гэтага зьезду выходзіць далёка за межы Чэхаславакіі. Водлуг слоў Адлера, зьезд гэты зьяўляецца днём воры другому Інтэрнацыяналу. Адлер далей адзначыў з жалем, што ма кангрэсе адсутнічае «буйная калёна камуністычнага пралетарыяту», прычым тлумачыў гэта «раскольніцкаю тактыкаю» камінтэрну. Адлер заявіраў, што сацыял-дэмакраты бяруць цвёрда на сябе задачу аб'яднаць пралетарыят, прычым адмаўляюцца ад адзінага фронту на грунце культурнае ці прафсаюзнае працы. Адлер падкрэсьліваў, што сацыял-дэмакраты вераць у ажыцьцяўленьне адзінства толькі на грунце палітычнае барацьбы, а ня ў гэтых сумежных абласьцях.

Выступіўшы далей прадстаўнік нямецкіх сацыял-дэмакратаў Чох, даў у сваім выступленьні сумны малюнак сучаснага становішча. Чох падкрэсьліў, што ўсюды перамагае рэакцыя, і што Ліга Нацый поўнасьцю абярнулася ў зброю імпэрыялізму. Чох зазначыў, што перад міжнародным характарам рэакцыі барацьба пралетарыяту таксама павінна набыць міжнародны характар.

Зьезд ухваліў палітычную рэзалюцыю, у якой заяўляе, што ўсе сацыял-дэмакратычныя партыі Чэхаславакіі надалей будуць праводзіць барацьбу супольна. Рэзалюцыя зьмяшчае пастанову аб утварэньні аб'яднанага падрыхтоўчага камітэту для выпрацоўкі агульнае праграмы ўсіх сацыял-дэмакратычных партый Чэхаславакіі ў палітычных, эканамічных і нацыянальных пытаньнях. Далей рэзалюцыя зазначае, што сацыял-дэмакратычныя партыі Чэхаславакіі аб'ядняюцца для супольнае барацьбы проці буржуазнага ўраду на грунце прыняцьця дзяржаўнасьці. Пры гэтым рэзалюцыя падкрэсьлівае, што барацьба гэтая накіравана ня проці рэспублікі. Водлуг слоў рэзалюцыі, барацьба проці рэакцыі можа скончыцца посьпехам толькі пры ўмове аб'яднаньня пралетарыяту на прынцыпах дэмакратыі і сацыялізму. Рэзалюцыя заяўляе, што раскол пралетарскіх сіл „якім мы абавязаны камуністам", зьяўляецца лепшаю дапамогаю рэакцыі.

Бурнае пасяджэньне нямецкага парляманту

ПАТРАБАВАНЬНЕ КАМФРАКЦЫІ АБ АМНІСТЫІ ДЛЯ ПРАЛЕТАРЫЯЎ.—ПРАВАКАЦЫЙНЫЯ ВЫПАДЫ ТЭЎТОНЦАЎ.—ДЭПУТАТЫ-КАМУНІСТЫ БЫЛІ ВЫДАЛЕНЫ З ЗАЛІ.

БЭРЛІН, 28-1. Пры абмеркаваньні рэйхстагам каштарысу міністэрства юстыцыі камуніст Мюнцэнбэрг спыніўся на шэрагу судовых спраў аб так званай дзяржаўнай здрадзе і злачынствах у друку і сьцьвярджаў, што некаторыя з абвінавачаных па гэтых справах каруюцца судом толькі за адну прыналежнасьць да ліку службовых асоб кампартыі. У канцы Мюнцэнбэрг затрабаваў, каб рэйхстаг разглядзеў прапанову аб амністыі палітычным вынаволеным пралетарыям, якая пададзена кампартыяю ўжо некалькі месяцаў назад. У часе пасяджэньня некалькі разоў выбухалі вострыя спрэчкі між камуністымі і тэўтонцамі, у зьвязку з правакацыйнымі выпадамі аднаго тэўтонскага прамоўцы. Старшынствуючы Грэфэ (нацыяналіст) запрапанаваў некаторым камуністам-дэпутатам пакінуць залю, але адмовіўся ўжыць гэтую меру да тэўтонцаў.

ШПАРКІ РОСТ БЕСПРАЦОЎЯ.

БЭРЛІН, 28-1. Лік беспрацоўных у Нямеччыне, атрымліваючых дзяржаўную дапамогу, за першую палову студзеня павялічыўся з 1400000 да 1600000 чалавек.

Тэрор ірляндзкіх рэспубліканцаў.

ЛЁНДАН, 30-1. Агенцтва Рэйтэра паведамляе: „Улада ірляндзкае больнае дзяржавы выкрыла змову рэспубліканцаў на жыцьцё нядаўна назначанага новага генэрал-губарнатара Джэмса Мак-Нэйла. Паліцыя ўжыла надзвычайныя захады для аховы генэрал-губарнатара.

У Дубліне, у канцы мінулага тыдню, здарыліся новыя непакоі рэспубліканцаў. Стрэлам з рэвальвэру паранен начальнік астрогу „Маунт-Джой". Адзін з агентаў ірляндзкае паліцыі, за якім сачылі двое ўзброеных людзей, забіў аднаго з іх".

Нарвэскія воднікі на фронце пралетарскага адзінства.

ЗА САЮЗ З ПРАЛЕТАРЫЯТАМ СССР.

ОСЛО, 28-1. Нарвэскі саюз маракоў і качагараў суднаў ухваліў дамагацца прыёму саюзу прапаўнікоў воднага транспарту СССР у міжнародную федэрацыю транспартных рабочых і ў скандынаўскую федэрацыю рабочых транспарту, а таксама спрыяць утварэньню скандынаўска-фінска-расейскага камітэту рабочых воднага транспарту. Пасьля разгляду гэтых пытаньняў на зьезьдзе нарвэскага саюзу маракоў і качагараў суднаў і на канфэрэнцыі скандынаўскае федэрацыі рабочых транспарту мяркуецца склікаць расейска-фінска-скандынаўскае канфэрэнцыі.

ОСЛО, 28-1. У нарвэскім парахоўдзтве насьпявае канфлікт, бо ўласьнікі суднаў хочуць зьвініць заработак воднікаў. Саюз маракоў і качагараў суднаў перарваў перамовы з уласьнікамі суднаў і ўхваліў абвясьціць 1-га лютага забастоўку. Забастоўка ахопіць 8 тысяч чалавек.

Перамогі савецкае нафты ў Амэрыцы.

АМЭРЫКАНСКІ ГАНДЛЁВЫ ФЛЁТ ПЕРАХОДЗІЦЬ НА САВЕЦКУЮ НАФТУ.—АБВАСТРЭНЬНЕ БАРАЦЬБЫ МІЖ „СТАНДАРТ ОЙЛЬ" І ДЭТЭРДЫНГАМ.—УРАД АМЭРЫКІ ПАДТРЫМЛІВАЕ „СТАНДАРТ ОЙЛЬ".

НЬЮ-ЁРК, 27-1. Водлуг паведамленьня «Нью-Ёрк Таймс», урадавы гандлёвы флёт Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў купляе для сваіх патрэб у амэрыканскай нафтавай кампаніі «Стандарт Ойль» савецкую нафту. Адміністрацыя гандлёвага флёту заяўляе, што пытаньне местароду нафты, якую яна купляе, яе не датычыць.

Факты апошніх дзён гавораць, што ўрад Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў падтрымлівае «Стандарт Ойль» у яго барацьбе проці англа-галяндзкае кампаніі Дэтэрдынга «Ройяль Детч Шелл». Гэтыя факты выявіліся ў наступным: заява марскога міністэрства Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў Вільбура, што марское міністэрства намерана перашкодзіць спробам Дэтэрдынга купляць нафту з забраніраваных за міністэрствам запасаў (гэтую нафту Дэтэрдынг меркаваў выкарыстаць для канкурэнцыі з «Стандарт Ойль» па азіяцкіх рынках), пагроза Куліджа забараніць ангельскім кампаніям эксплёатаваць нафтавыя вучасткі ў Амэрыцы, закупка ўрадавым гандлёвым флётам Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў 24 тысяч тон савецкай нафты ў нью-ёрскае фірмы «Стандарт Ойль» і заява адміністрацыі флёту, што «пытаньне аб местароду гэтае нафты яе не датычыць».

Барацьба між «Стандарт Ойль» і «Ройяль Детч Шелл» абвастраецца. Паведамляюць, што Дэтэрдынг, які ўжо вінен амэрыканскім фінансістам значную суму, адчуваючы патрэбу ў капіталах, спрабуе дастаць новую пазыку ў амэрыканскіх банкаў. Аднак, «Стандарт Ойль» усімі сродкамі стараецца перашкодзіць атрыманьню гэтае пазыкі.

У кампэтэнтных колах лічаць, што фінансавае становішча „Стандарт Ойль" у сучасны момант лепшае, чым Дэтэрдынга.

ЗА АДНАЎЛЕНЬНЕ ФРАНКА-САВЕЦКАЕ КАНФЭРЭНЦЫІ.

ПАРЫЖ, 28-1. Старшыня камісіі палаты дэпутатаў па вугольнай і нафтавай прамысловасьці Барон і старшыня камісіі палаты дэпутатаў па справах вызваленых абласьцёў Філіпото зьвярнуліся да прэм'ера Пуанкарэ з лістом, у якім просяць яго ўжыць захады з мэтаю паскорыць аднаўленьне працы франка-савецкае канфэрэнцыі.

РОСТ КАМУНІСТЫЧНЫХ НАСТРОЯЎ У ШАНХАІ.

ШАНХАЙ, 29-1. Кантонская ўлада арыштавала на адной з тэкстыльнай фабрык 7 рабочых па абвінавачаньні ў камуністычнай прапагандзе. Водлуг заваяньня паліцыі, пры арышце, нібы, захоплены 3 скрыні з праклямацыямі".

* * *

ШАНХАЙ, 29-1. „Шанхай Мэркуры" паведамляе, што сярод рабочых прадпрыемстваў па выраба гатовае вэрхаты разгортваецца рэвалюцыйны рух. Сярод служачых прадпрыемстваў таксама адзначаецца рэвалюцыйны настрой.

КАМУНІСТЫЧНЫЯ ПЛЯКАТЫ НА ВУЛІЦАХ ШАНХАЮ.

ШАНХАЙ, 26-1. Газэта «Шанхай Мэркуры» паведамляе, што 24 студзеня ў розных райёнах Шанхаю былі знойдзены камуністычныя плякаты з заклікам да рабочых, сялян і салдат скінуць сучасны ўрад.

РАССТРЭЛЫ Ў КАНТОНЕ.

ШАНХАЙ, 29-1. З Ганконгу паведамляецца, што 28-га ў Кантоне расстрэляна 27 камуністаў.

НАСТУП ПАЎДНЁЎЦАЎ НА ПОЎНАЧ.

ШАНХАЙ, 29-1. З Пукоу паведамляюць, што 27-га студзеня паўднёвыя сілы захапілі горад Ханьчжуан, на чыгунцы Пукоу—Цяньцзінь, у правінцыі Шандунь каля самае мяжы Цьзінсу.

ЯПОНСКІ ДЭСАНТ.

ШАНХАЙ, 30-1. «Рэспублікан Дэйлі Ньюс» паведамляе, што 21-га студзеня японскае вайсковае судна высадзіла атрад марское пяхоты, які заняў руднікі ў Даі (правінцыя Хубэй). Ханькоуская ўлада арганізавала дэманстрацыю пратэсту.

МЭТЫ ПАДАРОЖЖА 3-Х НАНКІНСКІХ МІНІСТРАЎ.

ШАНХАЙ, 29-1. Кантонскі дыктатар Лі-Ці-Сін пас аў дэлегата ў Гангконг да нанкінскіх міністраў Сунь-Фо, У-Чжао-Чу і Ху-Хан-Міна, каб перашкодзіць іх пераезду ў Кантон і не выяжджаць у Эўропу. (Водлуг паведамленьняў шанхайскае „Ван-Бао", трое гэтых нанкінскіх міністраў едуць у Эўропу „для вывучэньня ва гаспадарчага становішча).

Нямеччына пастаўляе зброю мукдэнцам.

Выкрываньні т. Штэкера ў рэйхставе.

БЭРЛІН, 26-1. На пасяджэньні камісіі рэйхстагу па замежных справах камуністычны дэпутат Штэкер выступіў з выкрываньнямі наконт пастаўкі зброі Чжан-Цзо-ліну з Нямеччыны. Штэкер паведаміў што, водлуг афіцыйнае заявы міністра замежных спраў нанкінскага ўраду, У-Чжаочу, Чжан-Цзо-лін і іншыя навучныя генэралы заказалі нямецкім фірмам зброі на агульную суму каля 20 мілёнаў марак. Нядаўняе затрыманьне ў Кілі транспарту зброі, якая прызначалася для пасылкі ў навучны Кітай, паказала, што заказы Чжан-Цзо-ліна выконваюцца нямецкімі фірмамі пры дапамозе некаторых чыноўнікаў морскага ведамства.

Адказваючы Штэкеру, Штрэзэман заявіў, што ён неадкладна дасьць загад расьсьледваць пытаньне аб пастаўцы зброі ў Кітай з Нямеччыны. Адначасна Штрэзэман заявіў што, водлуг яго вестак, чыноўнікі марскога ведамства ня маюць нічога супольнага з пасылкаю зброі, затрыманае ў Кілі.

Абмяркоўваючы гэтыя спрэчкі ў камісіі па замежных справах, „Бэрлінэр Тагеблят" называе імёны тых афіцэраў і чыноўнікаў марскога ведамства, якія спрыялі пасылцы затрыманага ў Кілі транспарту зброі.

Аўтары „ліста Зіноўева".

БЭРЛІН, 29-1. На ўчарайшым пасяджэньні працэсу Шрэка, які адказвае перад лейпцыгскім вярхоўным судом на абвінавачаньні ў шпіянажы на карысьць Польшчы і ў падробе дакумэнтаў наконт рэйхсвэру, выступіў у якасьці сьведкі прыехаўшы на ўласным жаданьні з Жэневы вядомы нацыфіст Мэртэнс. Мэртэнс паказаў пад прысягаю, што ў сакавіку 1927 г. адзін з ангельскіх публіцыстаў, які жыве ў Жэневе, паведаміў яму, што падроб так званага ліста Зіноўева зьяўляецца справаю рук польскага шпіёна Пацюркоўскага, працаваўшага ў тчыльным супрацоўніцтве з абвінавачаным Шрэкам.

Ліст Зіноўева, як відаць, быў зроблен у Берліне на Ангальтштрасэ № 1, дзе Шрэк жыў да кастрычніка 1925 г. Пацюркоўскі жыў у Берліне з 1924 да 1926 году, і раптам зьнік з Берліну на аўтамабілі, хаваючыся ад розыскаў у зьвязку з лістам Зіноўева. У працягу ўчарайшага дню на працэсе Шрэка была таксама ўстаноўлена сховасьць Пацюркоўскага з асобаю, якая загадвала ў свой час прэс-бюро польскага пасольства ў Берліне і мела такое-ж прозьвішча.

САН-ГАТАРДЗКІ ВУЗЕЛ ІМПЭРЫЯЛІСТ. СУПЯРЭЧНАСЬЦЯЎ.

НАПАДКІ ІТАЛЬЯНСКАЕ ПРЭСЫ НА ФРАНЦЫЮ.

РЫМ, 28-1. Увесь італьянскі друк паведамляе аб нападках французкіх газэт на Італію ў зьвязку з тайным правозам зброі праз Вэнгрыю (гэтая зброя прыбыла з Італіі), але толькі некаторыя газэты абмяркоўваюць гэтыя паведамленьні.

Газэта «Тэвэрэ» піша: «Гісторыя з правозам куляметаў праз Вэнгрыю зрабіла больш шуму, чымся выгрузка французкім параходам зброі і самалётаў у югаслаўскім порце.»

ФАШЫСЦКІ ПАДПЯВАЛА.

РЫМ, 28-1. Румынскі міністр замежных спраў Тытулеску, які ў сучасны момант знаходзіцца ў Рыме, у гутарцы заявіў: «Ня ўся Малая Антанта, а толькі адна з дзяржаў Малое Антанты» зьвярнулася да Лігі Нацый наконт тайнага правозу зброі праз Вэнгрыю (Тытулеску мае на ўвазе Чэхаславакію).

Нямецка-літоўскі арбітражны ўгавор.

БЭРЛІН. 29-1. Агенцтва Вольфа паведамляе: «Водлуг прыватных вестак, перамовы між Штрэзэманам і Вальдэмарасам аб нямецка-літоўскім арбітражным угаворы сёньня скончыліся. Угавор падпісан.

АД'ЕЗД ВАЛЬДЭМАРАСА З БЭРЛІНУ.

БЭРЛІН. 29-1. Агенцтва Вольфа паведамляе: «Сёньня ўвечары літоўскі прэмер Вальдэмарас выехаў з Бэрліну ў Коўню".

Камуністычная арганізацыя вэнгерскіх рабочых у Турцыі.

КАЛЯ 100 РАБОЧЫХ АРЫШТАВАНА І ВЫСЫЛАЕЦЦА Ў ВЭНГРЫЮ.

АНГОРА, 28-1. Анаталійскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе: «48 вэнгерскіх рабочых, абвінавачаных у камуністычнай прапагандзе, будуць пасланы заўтра ў Канстантынопаль для далейшае высылкі ў Вэнгрыю. Агульны лік вэнгерскіх рабочых, арыштаваных па абвінавачаньні ва ўдзеле ў камуністычнай працы і ў прапагандзе сярод іншых рабочых, больш 100. Усе яны будуць высланы паступова з Турцыі.

Як завяраюць, усе гэтыя рабочыя належаць да вэнгерскае камуністычнае арганізацыі і праз увесь час займаліся ў Вэнгрыі партыйнаю працаю. Прыехаўшы ў Турцыю шукаць працы, яны ня спынялі камуністычнае прапаганды, наладжвалі тайныя сходы і распаўсюджвалі камуністычныя брашуры і кнігі. Паліцыя была асьвядомлена аб іх дзейнасьці і арыштавала іх, захапіўшы пры арышце пячаткі арганізацыі, а таксама рэвалюцыйныя брашуры і кнігі».

Рэпрэсіі проці амэрыканскае кампартыі.

НЬЮ-ЁРК, 14-1. Суд прысудзіў 7 рабочых да штрафу ў 25 даляраў кожнага за ўдзел у сьвяткаваньні 10 гадавіны Кастрычнікавае рэвалюцыі. Чатыры члены кампартыі аддадзены пад суд за распаўсюджаньне лістоўак цэнтральнага камітэту кампартыі з пратэстам проці чыннасьці ўлады ў адносінах да бастуючых гарнякоў.

Суровая цэнзура.

ВЕНА, 24-1. Па загадзе міністра ўнутраных спраў Югаславіі пошта і тэлеграф будуць сурова кантраляваць пакеты і лісты з заграніцы. Усе забароненыя ў Югаславіі газэты, часопісі і лісты будуць зьнішчацца. Вінаватыя ў парушэньні гэтага загаду паштовыя чыноўнікі будуць прыцягвацца да адказнасьці законам аб абароне дзяржавы, як за процідзяржаўную прапаганду.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

Перад выбарамі ў сойм.

Пэлээсы вядуць агітацыю на расейскай мове.

«Кур'ер Віл.» паведамляе, што ў шмат якіх мясцовасьцях на абшарах Віленшчыны ППС вядуць сярод насьленьня перадвыбарную агітацыю на расейскай мове. ППС выдала таксама і адозвы на расейскай мове і распаўсюджвае іх па беларускіх вёсках.

Канфіскацыя адозваў.

Па загаду адміністрацыйнай улады сканфіскаваны перадвыбарныя адозвы, выданыя будаўляным прафсаюзам. Як паведамляе «Слово», адозвы мелі камуністычны зьмест.

Выбарная «работа».

Партыя „Вызваленьне" склікала ў Кельцах мітынг, на які прыехалі віцэ-маршалак сэнату Возьніцкі і гр. Багінскі і Смала. Паліцыя прывяла з сабою на мітынг групу хуліганаў, якія сталі крычаць і нагаварваць трымаць сябе выклікаюча. Як аказалася, гэта патрэбна было паліцыі, каб прычапіцца да скандалу і на гэтай аснове зачыніць мітынг.

350 тысяч беларускіх адозваў.

«Дз. Віл.» паведамляе, што адна з віленскіх друкарань атрымала заказ на 360.000 беларускіх адозваў і пытаецца, адкуль беларусы бяруць патрэбныя для гэтага грошы.

ПОЛЬСКА-НЯМЕЦКІЯ ГАНДЛЁВЫЯ ПЕРАМОВЫ.

ВАРШАВА, 28-1. Польскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе: у Варшаве скончыліся перамовы між прадстаўнікамі польскіх і нямецкіх гандлёва-прамысловых колаў. Абодвы бакі прызналі, што перамовы далі спрыяючыя вынікі для эканамічных узаемадачыненьняў між Польшчаю і Нямеччынаю.

Камуністычная дэманстрацыя ў Варшаве.

У Варшаве два разы рабіліся спробы арганізаваць камуністычныя дэманстрацыі. У ваколіцы фабрыкі „Паравоз" сабралася каля 500 рабочых, якія арганізавалі дэманстрацыю і хацелі прайсьці ў цэнтр гораду. Конная паліцыя на пусьціла рабочых у горад.

Беспрацоўе ў Горнай Сілезіі.

Беспрацоўе ў Горнай Сілезіі (польскай) расьце. Паводле статыстычных даных, на 18 студзеня лік беспрацоўных раўняўся 46.000 асоб.

Справа б. пасла Рагулі.

«Слово» паведамляе, што б. пасол Рагуля быў арыштаваны і потым выпушчан пад залог на волю. Сьледзтва па справе выступленьня Рагулі на мітынгу ў Магаградку яшчэ ў 1924 г. ужо закончана. Рагуля абвінавачваецца па 129 арт. К. К. Яму пагражае катаржны вастрог.

Пагрозы Паўлюкевічу.

Паўлюкевіч, як паведамляе «Слово» (№ 23), атрымаў два пагражаючыя лісты—адзін з Куровца, Вілейскага пав., а другі з Шаркаўшчыны, Дзісьненскага пав. У апошнім лісьце Паўлюкевіч папераджаецца, што тое што зрабіў з Войкавым яго выхаванец Кавэрда, будзе зроблена і з Паўлюкевічам.

Сыстэматычная канфіскацыя «Думкі Працы».

Урадавы камісар у Вільні загадаў сканфіскаваць № 8 радыкальнай беларускай газэты «Думкі Працы» за артыкул «Памагаюць».

Працэс Грамады.

«Дзеньнік Віленскі» паведамляе, што тэрмін пачатку працэсу Беларускай с.-р. Грамады у Віленскім акруговым судзе канчаткова вызначан на дзень 23 лютага г. г. На расправу пакліканa 421 сьведка і 8 экспэртаў з боку пракурорскай улады і 350 з боку абвінавачаных. Абарона будзе прадстаўлена 5 адвакатамі па назначэньні і іншымі, якія прыедуць у Вільню з іншых гарадоў. Вядома, што на працэс прыедуць адвакаты: ген. Бабінскі, Сьмяроўскі і Гонічвіль з Варшавы, Глушкевіч з Львова.

У АПОШНІ ЧАС.

(Атрымана а 1 гадз. уночы).

ТАВ. ДАЎГАЛЕЎСКІ Ў ПУАНКАРЭ.

ПАРЫЖ, 30-1. 28-га студзеня паўнамоцны прадстаўнік СССР у Францыі Даўгалеўскі паведаў Пуанкарэ і аб франка-савецкіх перамаўленьнях.

ТАНАКА НАВЕДАЎ ТРАЯНОЎСКАГА.

ТОКІЁ, 30-1. Танака паведаў паўнамоцнага прадстаўніка СССР у Японіі Траяноўскага. Візыт зьяўляецца адказам на нядаўняе наведаньне міністра Траяноўскім.

НАСТУП ФЫНЬ-ЮЙ-СЯНА.

ПЕКІН, 30-1 Паведамляюць, што войска Фынь-Юй-Сяна ў 25 кілёмэтрах ад Таміньфу. Паўночна-заходнія вароты гораду зачынены. У заходняй частцы правінцыі Шаньдун войска Фынь-Юй-Сяна перайшло Жоўтую рэчку. Чжан-Цзун-Чан сьпешна пасылае войска дзеля абароны Цечжоу на паўночна-заходняй граніцы Шаньдун.

ВОБЫСКІ І АРЫШТЫ Ў ШАНХАІ.

ШАНХАЙ, 30-1. 29-га студзеня быў зроблены вобыск у памяшканьні прафсаюзаў рабочых шкляных прадпрыемстваў. Арыштавала 114 членаў саюзу. 11 рабочых, арыштаваных раней па абвіненьню ў «камуністычнай дзейнасьці», расстраляны 27-га студзеня.

* * *

ШАНХАЙ, 30-1. У Ханькоу арыштавана каля 70 асоб па абвіненьню ў «камуністычнай дзейнасьці».

СЬМЕРЦЬ ФЭЛЬДМАРШАЛА ХЭЙГА.

ЛЁНДАН, 30-1. У нядзелю памёр ад разрыву сэрца фэльдмаршал Хэйг, які камандаваў ангельскімі сіламі ў Францыі і Бэльгіі ў імпэрыялістычную вайну.

За дзень.

„Рабочы" ўрад Нарвэгіі.

У Нарвэгіі ўпяршыню за ўсю яе гісторыі да ўлады прышоў «рабочы» ўрад.

Парляманцкія абставіны, якія склаліся ў гэтай краіне ў выніку кастрычнікавых выбараў, блізка напамінае становішча ў Англіі ў момант стварэньня «рабочага» ўраду Макдональда. У Нарвэгіі, як і тады у Англіі, кіруючая (таксама кансэрватыўная) партыя страціла большасьць, а апазіцыйная буржуазная партыя (лібэралы) адмовілася ўвайсьці ў буржуазны блёк, у якім яна грала-б другую скрыпку, і выбрала ролю пануючага «сацыялістычнага» ўраду.

Нарвэская рабочая партыя ў арганізацыйнай адносіне досыць дакладная копія ангельскай. Яна пабудавана на калектыўным членстве і складаецца, галоўным чынам, з буйных і дробных прафарганізацый.

Яшчэ год таму назад у партыі пераважна былі псэўда-рэвалюцыйныя цэнтрысцкія элемэнты, якія прапаведвалі неабходнасьць «па-за парляманцкай» барацьбы (поруч з парляманцкай працай) і адхіляўшыя думку аб удзеле ва ўрадзе пры панаваньні буржуазеі.

Аднак, зьліяньне рабочай партыі з невялікай партыяй сацыял-дэмакратаў, якое адбылося ў мінулым годзе, павялічыла ў ёй уплыў правага, адкрыта-рэфармісцкага крыла.

Пасьля перамогі на апошніх выбарах гэтае крыло, у выніку нядоўгай барацьбы, перамагло цэнтрыстаў, і лідэры партыі прынялі міністэрскія партфэлі з рук „яго вялікасьці".

Крызіс кааліцыі ў Нямеччыне.

Рэакцыйны школьны закон прыбліжа з паўгоду ўжо падрыхтоўваецца ў Нямеччыне. Сутнасьць гэтага закону заключаецца ў тым, што папам каталіцкім і пратэстанскім перадаецца ня толькі выкладаньне закону божага, але і кантроль за ўсім выкладаньнем і выхаваньнем у школе. Гэты закон зьяўляецца вынікам зьдзелкі двух каалiцыйных партый: рэакцыйна-манархісцкай партыі нацыяналістаў і каталіцкай партыі цэнтру. Каталіцкі цэнтр даўно ўжо імкнецца ўзяць школу ў свае рукі. Адразу пасьля рэвалюцыі 1918 г. ён гэтага зрабіць ня мог, а зараз у зьвязку з агульным наступам рэакцыі ў Нямеччыне каталіцкі цэнтр занатрабаваў перадаць школу ў поўнае распараджэньне духавенства.

Калі цэнтр—партыя каталіцкая, дык нацыяналісты ў пераважнай большасьці зьяўляюцца прадстаўнікамі пратэстанскага дваранства і пратэстанцкай буйнай буржуазеі. Яны са свайго боку лічаць, што папы зьяўляюцца лепшымі агітатарамі пакорнасьці. Школьны закон павінен быў на вечнасьць замацаваць саюз паміж гэтымі партыямі. Таму міністр асьветы нацыяналіст і пратэстант Кейдэль з вялікай рашучасьцю ўзяўся за ажыцьцяўленьне гэтага пляну.

І ўсё-ж гэтак таленавіта задуманая камбінацыя правалілася. У камісіі рэйхстагу гэты закон быў правален: супроць яго галасавала 15, за—12. Сярод працўўнікаў закону апроч левых партый аказаліся нямецкая народная партыя, партыя Стынэса і Штрэзэмана, буйнейшая партыя буйнай прамысловасьці і асновы ўсёй кааліцыі.

Зразумела, што і народная партыя нічога ня мае супроць таго, каб папы выхоўвалі дзяцей рабочых, але тут пытаньне куды глыбей, бо разгалосьсі ўнутры кааліцыі ў апошнія часы асабліва даюць сябе адчуваць. Нацыяналісты лічаць, што ўжо надышоў момант для аднаўленьня манархіі ў Нямеччыне, у той час як народная партыя няўпэўнена яшчэ ў мэтазгоднасьці гэтай камбінацыі.

Правал школьнага закону зьяўляецца першым крокам на шляху развалу нямецкай сучаснай кааліцыі.

Абшарнікі распраўляюцца.

Польскія абшарнікі, якія амаль ні пагалоўна ўступілі ў «Беспартыйны блёк супрацоўніцтва з урадам», адчуваючы сваю бясспрасьць і пакаваньне з боку ўраду, пачалі распраўляцца з сваімі работнікамі і выдаляць іх з маёнткаў. Беспрацоўныя работнікі сярод голаду і холаду вандруюць ад фольфарку да ф

У Саюзе ССР.

Хлебазагатоўкі

НОВАСІБІРСК, 28-I. За пятую пяцідзёўку ў Сібіру загатавана хлеба столькі-ж, колькі і за 4 ю. Ры гэтым па заходніх акругах наглядаецца павялічэньне загатовак на 11 проц., па ўсходніх—зьніжэньне на 16 проц. На першым месцы стаіць Бійская округа, на апошнім—Кузьнецкая.

ЦЮМЕНЬ, 28 I. За 5-ю пяціднёўку загатавана 190 тысяч пудоў—амаль у чатыры разы больш, чымся за мінулую 5-ціднёўку.

ПАД СУД ЗА ХАЛАТНАСЬЦЬ.

АДЭСА, 27-I. Па загадзе пракуратуры аддадзены пад суд арыштаваныя за злаўжываньні ўладаю і за бязьдзейнічаньне ў хлебазагатоўках старшыні сельсавету сёл Арнящоўка, Асіпаўка і Астравец, а таксама старшыня сельска-гаспадарчага таварыства вёскі Цэбрыкова, раздаўшы кулаком крэдыт на 20 тысяч руб. з каапэрацыйных сродкаў.

БАГАМОЛЬНЫЯ ЗАГАТОЎЦЫ.

ДНЕПРАПЯТРОЎСК, 28-I. Выязная сэсія акруговага суду ўхваліла прысуд на справе шэрагу працаўнікоў нізавое сельскае каапэрацыі, спыніўшых хлебазагатоўкі ў дні калян. Загадчык ссыпным пунктам Андрэеўскага сельскага адзінага спажывецкага таварыства засуджан да 1 з палов. гадоў зьняволеньня, загадчык крамы таго-ж таварыства—да аднаго году зьняволеньня і старшыня праўленьня адзінага спажывецкага таварыства—да 2-х гадоў.

„Наш адказ Чэмбэрлену".

МАСКВА, 28-I. 28-га лютага ў дзень гадавіны Чырвонае арміі адбудзецца ўрачыстая перадача 60 самалётаў вайскова-паветраным сілам РСЧА. Гэтыя самалёты пабудаваны на сродкі, сабраныя рабочымі арганізацыямі ў фонд „Наш адказ Чэмбэрлену". З 60-ці самалётаў 38 пабудаваны на сродкі, сабраныя прафсаюзамі.

Увага пазыцы ўзмацненьня сельскае гаспадаркі.

МАСКВА, 28-I. Член прэзыдыуму ЦВК СССР, старшыня ўсесаюзнае камісіі па рэалізацыі пазыкі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі т. Пахомаў у гутарцы з супрацоўнікам ТАСС зазначыў, што ўся грамадзкая ўвага павінна быць накіравана на справу рэалізацыі гэтае пазыкі. Усе грамадзкія арганізацыі, асабліва вясковыя, усе культурныя сілы вёскі павінны весьці працу па рэалізацыі. Усе павінны паставіць сабе задачаю дамагчыся, каб сапраўды не засталося ніводнае сялянскае гаспадаркі, якая ня кела-б аблігацый пазыкі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі.

Новы старшыня КрымЦВК.

СІМФЭРОПАЛЬ, 28-I. Пазачарговая сэсія КрымЦВК па прапанове камфракцыі пастанавіла зьняць Велі Ібрагімава з пасады старшыні КрымЦВК і выключыць яго з членаў КрымЦВК. Старшынёю КрымЦВК'у абраны Мэмэт Ізмаіл Кубаў, які паходзіць з беднай сялянскай сям'і, член партыі з 1917 г.

Абсьледаваньне рабочага часу.

МАСКВА, 28-I. У зьвязку з падрыхтоўчаю працаю да пераходу на 7-мігадзінны дзень ЦСУ СССР атрымала заданьне правесьці абсьледаваньне рабочага дню ў прамысловасьці. Будзе абсьледавана 2500 прадпрыёмстваў, якое ахопіць каля 2,3 міліёна рабочых.

Спробнае абсьледаваньне даўжыні рабочага дню на 15-ці буйнейшых прадпрыёмствах розных райёнаў СССР у тым ліку ў Маскве, Ленінградзе, Іванава-Вазьнясенску і розных гарадох паказала, што настаўленыя ЦСУ задачы можна ажыцьцёвіць.

Салідарнасьць з лёнаўтаванымі швэдзкімі рабочымі.

МАСКВА, 28-I. 2-га студзеня ў Швэдыі абвешчан лёкаут 15537 рабочым папяровае прамысловасьці. ЦК саюзу рабочых па вырабе паперы СССР выказаў гатоўнасьць падаваць лекаутаваным шырокае матар'яльнае і братэрскае падтрыманьне.

Беспрацоўнае студэнцтва і біржы працы.

МАСКВА, 28-I. УЦСПС зазначыў Наркам Працы СССР, што беспрацоўныя студэнты ня могуць рэгістравацца на біржы працы, бо асноўным іх заняткам зьяўляюцца заняткі ў ВНУ. На думцы ЎЦСПС рэгістрацыя беспрацоўных студэнтаў павінна быць наладжана ў спэцыяльных сталох біржы працы

ЗАГАТОЎКА ХЛЕБА І СЫРАВІНЫ.

Смальнянскі каапэратыў здаў „канцэсію" на загатоўку мяса прыватнікам.

76 С.-Г. КААПЭРАТЫВАЎ ЗА 20 ДЗЁН СТУДЗЕНЯ ЗАГАТОВІЛІ ХЛЕБА І СЫРАВІНЫ НА 294.000 РУБ.

Недарэчнасьці ў загатоўках.

(Коханаўскі райён, Аршаншчына).

Хлеб закупляў прыватнік.

Да апошніх мерапрыёмстваў, якія ўжыты цэнтрам, справа з загатоўкамі ў нашым райёне стаяла вельмі слаба, і ў працы было шмат недарэчнасьцяў.

Папершае, трэба адзначыць, што хлеба на мясцовым рынку было досыць,—галоўным чынам, жыта і аўса. «Загатоўцамі»-ж былі ў большасьці прыватныя гандляры. Некаторыя з іх загатаўлялі шмат хлеба і адпраўлялі з райёну па 2 — 3 вагоны ці перавозілі ў іншыя райёны на падводах.

Каапэрацыя—дапамога прыватніку.

Каапэрацыя ня спала і чакала заважнога хлеба, на які рабіла акуратна заяўкі (Смальняны). Наогул, Смальнянская каапэрацыя «отличилась»—здала прыватным гандлярам на „канцэсію" мясную і піўную крамы. З Днепрасаюзу атрымалі каля 4000 руб. на загатоўку скураной сыравіны. Сам каапэратыў загатовіў на 1500 руб., рэшту даў прыватніку, відаць, на ўзмацненьне зваротаў апошняга. Справа зараз знаходзіцца ў дасьледваньні, і віноўныя будуць прыцягнуты да належнай адказнасьці.

Добры прыклад.

Цікава адзначыць, што Коханоўская с-гаспадарчая каапэрацыя па сваёй ініцыятыве ўвяла, на нашай думцы, добры парадак: **селянін прадае свае хлебныя лішкі ў свой каапэратыў, бо апошні гарантуе яму ў выпадку недахвату** хлеба вясной забясьпечыць апошніх па той-жа цане, па якой купляе ў сялян.

Вучэбная гаспадарка крэдытуе прыватніка.

Смальнянская вучэбная гаспадарка ніводнага фунта хлеба не прадала ў каапэрацыю, а лічыла за лепшае забясьпечваць прыватнікаў, якія нават карысталіся ў гаспадарцы крэдытам. Такім чынам, прыватным гандлярам гаспадарка прадала 1500 пуд. хлеба.

У заключэньне трэба адзначыць, што ў нашым райёне моцна спалі з сысканьнем страхавых плацяжоў; да гэтуль паступіла апошніх па райёне ўсяго толькі 35 проц.

З пажарнае вежы лепш відаць...

(Нібы фэльетон).

...азважаньні палітычнага характару ці наогул хітрыкі дыплёматыі мясцовых органаў улады былі прычынай таго, што Магілёўскі акруговы інспэктарыят гандлю атрымаў памяшканьне на пажарнай вежы—мы сказаць не бярэмся, але ..

Калі вам патрэбна ўзгодніць тое ці іншае пытаньне з гэтай установай, дык будзьце ласкавы проста на пажарную вежу.

Не падумайце, што ў Магілеве такі востры жыльлёвы крызіс..'

Не і не... Сам акрвыканком з іншымі інспэктарыятамі займае вялікі двохпагарховы будынак, у якім некалі зьмяшчалася ўся вельмі пышная царская стаўка. Наогул кажучы, нам, менчанам, цяжка і марыць аб тэй хуткасьці, з якою ў Магілеве можна знайсьці вельмі добрую кватэру.

Чытач, напэўна, зацікавіцца, у чымжа справа?

Тут можна толькі меркаваць... Магчыма, акрвыканком разважаў, што зьверху будзе лепш відаць усе недарэчнасьці ў загатоўках і гандлі, якіх, да слова сказаць, хапае; вось і пасадзілі на пажарную вежу, каб адтуль кіраваў справамі. Нават у выпадку чаго і трывогу можа зрабіць, бо пажарны звон тут-жа побач...

Магчыма, мы і мыляемся. Можа, магілеўцы разважалі і так: мы сацыялізм будуем, а гандаль пахне чымсьці старым, дык адсунем гэтую марудную справу ад сябе як найдалей. Ну і накіравалі...

Як хто, а мы нахільны застанавіцца на апошнім меркаваньні, бо паста-нова ўраду прадугледжвае тэхнічнае абслугоўваньне акргандлю, як і іншых інспэктарыятаў, апаратам акрвыканкому, а ў Магілеве...

Пытаемся інспэктара гандлю:

— Ну, як спраўляецеся ў сучасны важны момант на фронце загатовак?

— Ды вось цэлы дзень бегаю па пасяджэньнях і нарадах, і за гэты час так налічышся сходкаў, што ноччу ног ня чуеш, а ўсю ноч пішу пад капірку, пішу дырэктывы і інструкцыі гандлюючым арганізацыям. Бачыце, аж рука анямела,—думаю перайсьці на левую...

—А вы зьвярнуліся-б ў акрвыканком —ён жа павінен вас абслугоўваць.

— Зьвяртаўся і нават ня раз, але запрапанавалі напісаць дакладную запіску...

— Ну і што-ж?

—Яе-ж таксама прыдзецца пісаць ад рукі,—ужо лепш як-небудзь і так абыйдземся...

. . . . . .

Просім прабачэньня ў таварышоў магілеўцаў, бо, наогул, калі паглядзець на іх зьверху, дык народ яны добры. Пісалі-ж гэта з поваду тых адносін, якія існуюць на мясцох да акргандляў амаль што па ўсёй БССР.

Пэўная рэч, такія адносіны да органаў Наркамгандлю на мясцох не стваракоць ім належнага аўтарытету ў вачох гандлюючых і загатоўчых арганізацый.

А можа часткай таму мы і назіраем шмат недарэчнасьцяй у загатоўчай кампаніі? В—к.

ЗА 12 ДЗЁН ЗАГАТОЎЛЕНА 15.000 ПУД. ХЛЕБА.

ХОЙНІКІ, 30-I. З 15 студзеня загатоўкі хлеба ў Хойніцкім райёне рэзка павялічыліся. Так, з кастрычніка да 15 студзеня было загатоўлена 15.000 пуд., а з 15 да 27 студзеня таксама загатовілі 15.000 пуд. На гэтым тыдні ў Гомель накіравана 4 вагоны мяса, а 28 студзеня—6 вагонаў хлеба. Мясцовыя каапэрацыйныя арганізацыі скардзяцца на слабае забесьпячэньне сродкамі, што некалькі затрымлівае хлебазагатоўкі.

ЗАГАТОЎКІ ВАЛАКНА І ЯРАВЫХ КУЛЬТУР ПРАХОДЗЯЦЬ З ПОСЬПЕХАМ.

ГОМЕЛЬ, 30-I. Па 7 сельска-гаспадарчых таварыствах з пачатку кампаніі загатоўлена 6039 пуд. жыта, 12810 пуд. аўса, 3355 пуд. ячменю, 2928 пуд. ільнянага валакна, 3538 пуд. ільнянага семя і на 2400 руб. рознай скураной сыравіны. Апрача гэтага, загатоўлена пушніны на 1400 руб., шчаціны—на 235 руб.

ПОСЬПЕХІ ЁСЬЦЬ, АЛЕ ГЭТАГА ЯШЧЭ НЕДАСТАТКОВА.

Полацак, 30-1. У параўнаньні з мінулым годам сельска-гаспадарчая каапэрацыя мае невялікі посьпех у загатоўках сыравіны. Летась было загатоўлена сыравіны за год на 294.000 руб., а ў першым квартале 1927-28 году—на 293.000 руб.

Дзякуючы прынятым мерам, у студзені загатоўкі ажывіліся, асабліва насеньня культурных траў.

ПЕРШЫЯ АДПРАЎКІ ЛЕСАМАТАР'ЯЛАЎ.

Белдзяржгандаль гэтымі днямі пасылае ў Данцыг першыя партыі лесаматар'ялаў: 2 вагоны ясеневых кражаў, 4 вагоны альховых дошчак і 3 вагоны кляновых і грабавых кражаў.

Яшчэ больш узмацніць загатоўкі с.-г. каапэрацыі.

У БССР ёсьць 274 таварыствы сельска-гаспадарчай і крэдытн. с-г. каапэрацыі, якія вядуць загатоўчую працу. Весткі аб загатоўках пакуль што паступілі ад 76 таварыстваў.

За першыя дзьве дэкады студзеня гэтымі таварыствамі загатоўлена хлеба і рознай сыравіны на 294000 р. Пасьля выезду на месца шэрагу адказных працаўнікоў з цэнтру і акруг загатоўчая праца ажывілася, і зараз няма таварыства, якое не вяло-б тых ці іншых загатовак. Такім чынам, паказаная вышэй сума далёка яшчэ няпоўная, і, як мінімум, яе трэба падвоіць.

Што загатоўлена гэтымі 76 таварыствамі?

Мы тут спыніся толькі на асноўнай с.-гаспадарчай прадукцыі, якую загатовіла сельска-гаспадарчая каапэрацыя.

Так, розных хлебных культур загатоўлена 23790 пуд.; насеньня розных пасеўных траў—6649 пуд.; ільнянага семя—6893 пуд.; ільнянага валакна і пянькі—11124 пуд; скураной сыравіны буйнай на 11432 руб. і дробнай на 3952 руб.; апрача таго, па Полаччыне буйнай і дробнай скураной сыравіны загатоўлена на 5344 руб. Загатоўлена таксама на досыць значную суму—1913 руб. шчаціны і конскага воласу і на 16081 р. пушніны.

Сярод больш буйных загатовак можна таксама адзначыць яблыкі, якіх загатоўлена на 43300 р., і грыбоў—на 5545 р.

У заключэньне трэба сказаць, што хоць загатоўкі пашчэ сельска-гаспадарчай каапэрацыі крыху і ажывіліся, але гэтага яшчэ мала. Неабходна гэтую справу, ня спыняючыся, увесь час разьвіваць.

ЗАГАТОЎКА РЫЗЬЗЯ.

У бягучым апэрацыйным годзе ў БССР мае быць загатоўлена для ўнутранай прамысловасьці і для экспорту 9.000 тон рызьзя. За першы квартал усімі арганізацыямі загатоўлена каля 750 тон рызьзя, што складае 55 проц. квартальнага заданьня.

Па БССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Падрыхтоўка да сяўбы.

Ворша. У акрузе зараз узмоцнена вядзецца праца па падрыхтоўцы да сяўбы.

Шырока разгорнута праца па разьмеркаваньню крэдыту на культурнае гатункове насеньне, на ўгнаеньне і г. д.

На пляну мяркуецца адпусьціць: на травасеў—100000 руб., на насенаводзтва—13000 руб., на штучнае ўгнаеньне—15000 р., на звычайнае насеньне—35000 руб., на насеньне ільнудаўгунцу—15000 руб., закупку кармоў—10000 руб. і сельска-гаспадарчыя машыны—50000 р.

Прадугледжана ў пляне перавесьці на шматпольле 33442 гэктары.

У першую чаргу будуць пераводзіцца на шматпольле калектыўныя гаспадаркі.

Існуючыя насенныя таварыствы ў акрузе дадуць гатунковае насеньне, якое зьявіцца першым штурхачом да культурнага вядзеньня палявой гаспадаркі.

Намечана на машынах зямельных органаў, савецкіх гаспадарак і калектываў ачысьціць насеньня 4336,6 тон. На акрузе будзе закладзена 578 паказальных дзялянак.

Закуплена 32,5 тоны насеньня канюшыны, якое разьмяркована сярод райёнаў.

Для ўдзелу ў вясеньняй пасяўной кампаніі прыцягваецца ўвесь актыў акруговых, райённых установаў і ўвесь вясковы актыў.

С.

Паступленьне падатку ўзмацнілася.

Слуцак. За апошнія два месяцы паступленьне сельска-гаспадарчага падатку значна павялічылася. Да апошняга часу паступіла 152,556 руб. 81 кап. падатку і 7,601 р. 23 к. нядоімкі, або 83,2 проц. гадавога заданьня па падатку і 89 проц.—па нядоімцы.

Райвыканкомая была зьвернута самая сур'ёзная ўвага па спагнаньне падатку. Супроць злосных няплатнікаў, якімі зьяўляюцца заможнікі, былі прыняты суровыя меры. 129 спраў было накірована ў нарсуд і міліцыю для прымусовага сысканьня падатку. Але ні адзін з платнікаў не дапусьціў да апісаньня маемасьці, а ўносіў падатак і нядоімку. Гэтая мера ўскалыхнула ўсю масу платнікаў падатку.

У сучасны момант райвыканком прымае ўсе меры да тэрміновага ўзносу падатку за трэцюю рату, каб у далейшым зьвярнуць больш увагі на іншыя кампаніі.

П А.

ГАСТРОЛІ БЕЛ. ДЗЯРЖ. ВАНДРОЎНАГА ТЭАТРУ.

Нароўля, 30-I. З вялікім посьпехам праходзяць спэктаклі вандроўнага тэатру у м. Нароўлі, Мазырск. акругі. Будынак Нардому на 500 чалавек ня можа зьмясьціць жадаючых пабачыць спэктакль.

ПАД СУД ЗА ЗЛОСНЫ НЕПЛАЦЕЖ ПАДАТКАЎ.

Полацак, 30-1. Акрфінаддзел аддаў пад суд за злосны неплацеж падаткаў пяцёх гандляроў г. Полацку.

20.000 РУБЛЁЎ У ФОНД БЕДНАТЫ.

Ворша, 30-1. З Белсельбанку атрымана 20000 руб. крэдыту спэцыяльна на крэдытаваньне бядняцкіх гаспадарак. Крэдыт будзе выдавацца на асабліва льготных умовах.

ПАДРЫХТОЎКА ПРАЦАЎНІКОЎ ПА АГНЯТРЫВАЛАМУ БУДАЎНІЦТВУ.

Самахвалавічы, 30-1. У хуткім часе пры мясцовым т-ве агнятрывалага будаўніцтва будуць арганізаваны кароткатэрміновыя курсы па падрыхтоўцы працаўнікоў па агнятрываламу будаўніцтву. Курсы ральлічаны на 20 чалавек і будуць утрымоўвацца за сродкі Менскага акруговага зямельнага аддзелу.

ПАВЯЛІЧЭНЬНЕ ВЫРАБУ ЗАПАЛАК.

Гомель, 30-1. Запалачная фабрыка «Везувий» выпускае зараз 1500 яшчыкаў запалак у дзень. Кіраўніцтва фабрыкі праводзе зараз некаторае пераабсталяваньне і з 1 лютага фабрыка будзе выпускаць да 1700 яшчыкаў запалак у дзень.

ПАЗЫКА ЎЗМАЦНЕНЬНЯ СЯЛЯНСКАЕ ГАСПАДАРКІ.

СЯЛЯНЕ В. ДУБРОВЫ, КІСЯЛЁЎСКАГА С.-С., ПАСТАНАВІЛІ АДМОВІЦЦА АД ПРОЦАНТАЎ ПА ПАЗЫЦЫ.—РАБОЧЫЯ ЗАВОДУ „ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК" ПАДПІСАЛІСЯ НА 700 Р.

Рэалізацыя ў поўным разгары.

ВОРША, 30-I. (Ул. кар.). У Багушэўскім райёне рэалізацыя пазыкі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі ідзе пасьпяхова. Да 28 студзеня рэалізавана аблігацый пазыкі на 800 руб.

Рабочыя заводу «Чырвоны Кастрычнік» (Арш. акр.) падпісаліся на пазыку на 700 руб., яўрэйская земляробчая арцель «Чырвоны Кастрычнік» купіла аблігацый на 305 руб. і па Баранаўскім с.-с. падпісаліся на 300 руб.

Рэалізацыя пазыкі праходзіць пасьпяхова.

(Па тэлефону з Гомеля).

Папярэднія вынікі сьведчаць аб тым, што пазыка ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі зацікавіла сялянства. Так, в. Мархлеўскае (Хойніцкі райён) налічвае ўсяго 20 гаспадарак а падпісаліся на пазыку на 400 руб. У іншых пунктах гэтага району ўжо рэалізавана пазыкі на 2.000 руб.

У Рэчыцкім райёне прадана аблігацый на 2000 руб., у Гомельскім—на 1000 руб., у Веткаўскім райёне на нарадзе старшынь сельсаветаў і вясковага актыву ўсе прысутныя падпісаліся на 350 р.

Аддзяленьне Лесбелу ўзяло на сябе абавязак распаўсюдзіць пазыкі сярод сялянства на 10.000 р. Уся гэтае сума ўжо разьмяркована па лесазагатоўчых вучастках.

Болей такіх сялян!

(Асьвейскі райён, Віцебск. акр.).

У Асьвейскім райёне разгарнулася праца па распаўсюджваньні дзяржаўнай пазыкі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі. Утвораны камісіі, завярбована 30 агентаў, якія ўжо пачалі правадзіць сходы сялян дзеля растлумачэньня ролі і значэньня пазыкі. 26 студзеня праведзен сход сялян вёскі Дубровы. Кісялёўскага с.-с., на якім адназгодна пастаноўлена: усім набыць пазыку, адмовіцца ад атрыманьня процантаў па гэтай пазыцы і трымаць пазыку да сканчэньня яе тэрміну, не здаючы яе ў сел.-гаспадарчы падатак, страхоўку і не абменьваючы на грошы.

А. Д.

Купілі аблігацый на 142 р. 50 к.

Для больш пасьпяховай рэалізацыі пазыкі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі абрана райённая камісія. Гэтыя-ж самыя камісіі ўтвораны пры сельсаветах і ў буйных насельных пунктах. Да дробных насельных пунктаў прымацаваны ўпаўнаважаныя па рэалізацыі пазыкі. Апрача таго, у кожны насельны пункт накіраваны асобныя контр-агенты па распаўсюджваньні пазыкі.

Усяго ў райёне трэба рэалізаваць аблігацый на 75000 руб. Гэтая сума разьмяркована паміж асобнымі вёскамі, лясьніцтвамі, каапэрацыйнымі арганізацыямі і касамі ашчаднасьці. Школьным працаўнікам запрапанавана правесьці лекцыі аб пазыцы ў школах і на сялянскіх сходах.

Першаю здала падпіску на 142 руб. 50 к. вёска Ісэрна. Ёсьць упэўненасьць, што ўся сума будзе рэалізавана цалкам.

П. А.

СЕЛЬКОМЫ РЭАЛІЗУЮЦЬ ПАЗЫКУ.

(Церахоўка, Гомельшчына).

Райённы зьезд селькомаў адназгодна пастанавіў падпісацца кожнаму сельскаму камітэту сялянскай узаемадапамогі на 10 руб., а райённаму камітэту на 50 руб. Разам з тым пастаноўлена дабіцца, каб кожны сябра камітэту падпісаўся на пазыку і прыняў удзел у распаўсюджваньні апошняй.

БЕЛСЕЛЬБАНК РЭАЛІЗАВАЎ НА 305 РУБ.

Белсельбанк рэалізаваў пазыкі на 305 руб. Сярод падпішчыкаў на пазыку ёсьць сяляне і гарадзкія жыхары.

ПАРТЫЙЦЫ ДАЮЦЬ ПРЫКЛАД.

(Парычы, Бабруйшчына).

18 студзеня адбыўся пленум Парыцкага райкому партыі. Усе удзельнікі пленуму падпісаліся на пазыку ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі на 215 рублёў.

ЦІКАВІЦЦА ПАЗЫКАЙ І ГАРАДЗКОЕ НАСЕЛЬНІЦТВА.

МЕНСК. Галоўная каса ашчаднасьці да 30 студзеня рэалізавала пазыкі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі на 210 руб. Цікава адзначыць, што ў суботу адзін грамадзянін купіў аблігацый пазыкі на 100 руб.

Весткі адусюль.

Цэленс—старшынёю камісіі замежных спраў

Б. міністр замежных спраў Латвіі Цэленс выбран ціпер старшынёю камісіі замежных спраў латвійскага сойму.

Земляздрыг на Алясцы.

ЛЁНДАН, 26-I. Сюды надаслана паведамленьне, што на Алясцы ізноў адчуваліся моцныя падземныя штуршкі.

Лётная катастрофа.

27 студзеня пад Торнам здарылася лётная катастрофа з прычыны адарваньня крыла. Апарат згарэў. Лётнік наручнік Фольтэн таксама згарэў.

НАСТУП НА ТЭКСТЫЛЬШЧЫКАЎ ШТАТУ МАСАЧУЗЭТС.

НЬЮ-ЁРК, 15-I. Губарнатар штату Масачузэтс Фулер (які адмовіўся даравацьвіну Сако і Ванцэці) прапанаваў законадаўчаму збору штату дазволіць павялічыць рабочы дзень і зьменшыць заработак жанчын і дзяцей, занятых у тэкстыльных прадпрыёмствах штату Масачузэтс, каб даць магчымасьць тэкстыльным прадпрыёмствам штату канкураваць з тэкстыльнымі прадпрыёмствамі паўднёвых штатаў.

Вялікія гарады Амэрыкі.

Фэдэральнае статыстычнае бюро агалосіла наступныя лічбы адносна насельнасьці вялікіх амэрыканскіх гарадоў. Нью-Ёрк мае ціпер 5.970.000 жыхароў, Чыкага—3·102.800, Філядэльфія—2.035.900, Дэтруа—1.334.500, Клевэлэндз—972.500, Сэн-Люі—839.200 і г. д. Вашынгтон мае толькі 540.000 жыхароў.

Савецкая вынаходка ў Амэрыцы.

НЬЮ-ЁРК, 25-I. Першая дэманстрацыя „Тэрмэнавокса", электрычнага музыкальнага струменту савецкага вынаходцы Тэрмэна, адбылася ў Нью-Ёрку з вялікім посьпехам. Дэманстрацыя сабрала шматлікую публіку, у тым ліку шмат музыкантаў, вучоных і інш. Прэса ў спрыяючым тоне гаворыць аб вынаходцы. Тэрмэн распачынае турнэ па Злучаных Штатах і імкнецца атрымаць патэнт на некалькі сваіх вынаходак у Злучаных Штатах.

За службу ў польскай арміі.

Ваенны суд у Коўні прысудзіў Пятроўскага В. і Яблонскага А., абвінавачаных у тым, што, будучы літоўскімі грамадзянамі, яны служылі ў польскай арміі.—першага на 4 гады, а другога—на 6 год вастрогу.

Шляхі санацыйнай польскай палітыкі.

Другі артыкул польскай канстытуцыі пачынаецца словамі: «Вярхоўная ўлада ў Польскай рэспубліцы належыць народу». Народ выбірае сваіх прадстаўнікоў у сойм і сэнат, якія выдаюць законы і выбіраюць урад. Урад адказвае за сваю дзейнасьць перад соймам.

Так кажа канстытуцыя... Але, як амаль ні ўсё ў сучаснай Польшчы, пішацца вось так, а выгаварваецца гэтак.

Тое самае сталася і з канстытуцыяй. Пасьля маёвага перавароту ня сойм стаў выбіраць і скідаць урады, а ўрад стаў жартаваць і зьдзекавацца над соймам, спыніўшы ўрэшце яго дзейнасьць зусім.

Ад гэтай пары Польшча фактычна засталася без канстытуцыі. У сучасны момант у Польшчы ідзе перадвыбарная барацьба, у якой прымаюць жывы ўдзел усе партыі—і старыя, якія былі ў напярэднім сойме, і новыя, якія ўтварыліся толькі што. Гэтыя апошнія зьяўляюцца прадуктам палітыкі сучаснага ўраду, які паставіў сваёй мэтай разьбіць амаль ні ўсе чыста старыя польскія партыі і на іх месца ўтварыць новыя. Мала таго,—гэтыя новыя «партыі», якія маюць свае палітычныя і сацыяльныя асаблівасьці, яднаюцца між сабою ў адно цэлае на грунце «супрацоўніцтва з урадам», разумеецца, сучасным. Дзеля гэтага яны стваракоць «беспартыйны блёк супрацоўніцтва з урадам».

Гэты апошні ня мае ніякай палітычнай і сацыяльнай праграмы. І мець яе, разумеецца, ня можа, каб і хацеў. Бо як можна, напрыклад, стварыць аднолькавую пляцформу для абшарніка-манархіста і левага работніка ці селяніна. Гэта абсурд!

Тым ня менш, гэты абсурд, ад якога пахне амаль ні вар хцтвам, хочуць неяк ажыцьцёвіць, аб'ідзёвіць, і перакананць усіх, што ён патрэбен і што ў ім толькі і ратунак.

Справа тут вось у чым.

Пад уплывам крызісу парлямантарызму ў некаторых эўрапэйскіх краінах, а таксама ўзросту рэакцыі і фашызму ва ўсім сьвеце, у Польшчы сталі спачатку патроху, а з часам усё мацней разьвіваюцца ідэі фашызму. Яны знаходзілі ў Польшчы благапрыемную глебу тым болей, што польскі сойм быў зусім непрацаздольны. Незадоволеныя і соймам і дзейнасьцю дзяржаўнага апарату масы падтрымалі маёвы пераварот, чакаючы ад яго правадыра збаўленьня ад дзяржаўнага крызісу. Масам у гэты момант здавалася, што «Ён» усё зробіць, толькі «Ён» выратуе Польшчу з бяды.

І вось «Ён» пачаў рагаваць Польшчу. Сабраў навакол сябе сваіх прыхільнікаў, даў па баку сойму і сэнату і пачаў аздараўляць Польшчу. Аздараўленьне гэта ад самага пачатку і да апошніх дзён носіць вельмі арыгінальны характар. Галоўны націск аздараўленьня быў накіраван на палітычных ворагаў Пілсудзкага—перш усяго эндэкаў, хадэкаў, пястаўцаў і троху менш у бок розных іншых партый. Неприемных для маёвага ўраду людзей, нават з партыі польскіх сацыялістаў, да якіх сам „Ён" належаў у працягу 20-ці гадоў, сталі скідаць з пасад, ня спыняючыся нават перад такімі цынічнымі палітычнымі расправамі, як перакідка ў глухія захалусныя мясцовасьці на «Усх. Крэсах» былых апазіцыйных паслоў сойму, якія пасьля роспуску сойму мелі поўнае права вярнуцца на свае старыя месцы. Націск найшоў па ўсёй лініі. Адначасова газэты санацыйнага напрамку голасна выхвалялі маёвы ўрэд за яго дзейнасьць ва ўсіх галінах дзяржаўнага жыцьця, прыпісваючы толькі яму некаторыя посьпехі польскай палітыкі. Напрыклад, некаторае паляпшэньне фінансавых і гаспадарчых стасункаў услужаючыя газэты сталі прыпісваць выключна дзейнасьці маёвага ўраду, забываючы, што яно наступіла дзякуючы мерапрыёмствам папярэдніх урадаў у галіне раўнавагі бюджэту і праграмы ашчаднасьці. Забывалі і пра тое, што ў хуткім часе пасьля пераароту наступіла вельмі спрыяючая для польскай вугольнай прамысловасьці кан'юнктура з прычыны вугольнай забастоўкі ў Англіі, што страшэнна падняло гандлёвы балянс Польшчы. А цяпер? Няма забастоўкі, і ўжо некалькі месяцаў польскі гандлёвы балянс выказвае вялікія дэфіцыты.

Аб масавай эміграцыі польскіх работнікаў заграніцу санатары маўчаць, хоць эміграцыя ня зьменшылася. Затое многа гаварылі аб амэрыканскай пазычцы і аб заслугах ураду ў гэтай справе, а тое забывалі, што пазычка на гаспадарчыя мэты магла-б прыйсьці хутчэй, каб не маёвы пераварот.

У галіне капсалідацыі ўнутранага грамадзкага жыцьця ўсе натугі маёвага ўраду ня толькі не далі пажаданых для ўраду рэзультатаў, але прывялі к адваротным. Польскае грамадзянства, дзякуючы санацыйнаму націску, распылілася яшчэ на большы лік груп. Так, на выбарах у сойм у 1922 г. было заяўлена 22 дзяржаўныя сьпіскі, а ціпер—33. Гэта яскрава сьведчыць, што замест аб'яднаньня ўрад сваёю беспраграмнаю санацыяй дабіўся яшчэ большага разьяднаньня, як раней. І трудна дапусьціць, каб элементы, якія па выбарах будуць галасаваць за ўрад і якія аб'ядналіся ў «Беспартыйны блёк супрацоўніцтва з урадам», перамаглі на выбарах рэшту сьпіскаў. Хутчэй трэба чакаць перамогі элементаў апазіцыйных да ўраду і перамогі такой, якая выразна сьцьвердзіць маёваму ўраду, што яго праграмная беспраграмнасьць нікому не патрэбна.

Сапраўды,—ці-ж гэта ні анэкдот, што той, хто хоча за сабою весьці народ, ня кажа: куды, дзеля чаго, з якою мэтаю народ павінен ісьці за ім. Ён ня мае сваёй праграмы, ён сам ня ведае, куды ён ідзе ці куды пойдзе. Ён ня можа растлумачыць, з якою мэтаю ўсё гэта робіць. І ён кліча, нават больш—ён вымагае, каб усе пайшлі за ім.

Не! тут нешта не ў парадку.

Інакш рабілі тыя, хто хацеў, каб людзі слухаліся іх. Яны, хто-б ні былі—ці рэлігійныя, ці палітычныя, ці сацыяльныя, ці нацыянальныя, ці ваенныя правадыры,—заўсёды ведалі, чаго яны хочуць, якая іх мэта і чаго яны вымагаюць ад другіх. Яны ўпарта і ясна растлумачвалі народным масам свае тэзісы і, бывала, дасягалі сваёй мэты.

А то што... Смех ды і толькі!

І польскія газэты несанацыйнага напрамку не сьмяюцца, а рагочуць і нават зьдзекуюцца над такім палажэньнем, калі клічуць супрацоўнічаць, а ня кажуць, якая будзе праца.

Сьмяюцца і над тым, што выбары робяцца... адміністрацыяй.

Згодна з канстытуцыяй дзяржаўная адміністрацыя ня мае права ўмешвацца ў выбары, г. ё. запімацца агітацыяй, адных падтрымліваць, з другімі змагацца і г. д.

А што мы бачым ціпер у Польшчы? Газэты ўсіх кірункаў, апрача санацыйных, жаляцца, што адміністрацыя ўсьцяж умешваецца ў справы выбараў, навязвае сваіх кандыдатаў, агітуе і г. д., чым яўна парушае 2 арт. канстытуцыі.

Сьмяюцца і над тым, што ўрад імкнецца стварыць такі сойм, г. ё. такі «законадаўчы» орган, які выдаваў-бы законы па загаду ўраду. Дзеля гэтага і ўтворан «Беспартыйны блёк супрацоўніцтва з урадам», у які ўвайшлі людзі новага гатунку, якія згадзіліся ня толькі на «поўнае падтрыманьне» і нічога болей, але і на «падтрыманьне ў крэдыт» ва ўсім, што ўраду прыдзе ў галаву і чаго кандыдаты з «супрацоўнікаў» зусім ня могуць ціпер прадбачыць.

«Наш Пшэглёнд» пытаецца: «Ці гэта яшчэ—ў разуменьні гэтых паноў—маюць быць выбары, ці ўжо толькі маніфэстацыя «вернападданства»? Ці ідуць яшчэ ў палату, ці толькі—ў сені гэтай палаты»?

Ня можна не згадзіцца з „Нашым Пшэглёндам», што сучасны фашыстаўскі ўрад Польшчы хоча—насупроць 2-му артыкулу канстытуцыі—адабраць вярхоўную ўладу ад народу і выбранага ім сойму і прысвоіць гэтую ўладу сабе, а народ і яго прадстаўніцтва—сойм—зрабіць сваім падпявольным «супрацоўнікам».

Вось якімі хітрымі, завілістымі сьцежачкамі паступова ідзе так званая санацыя да пераароту—да ўтварэньня ў Польшчы новага «самадзяржаўнага» рэжыму і поўнай перамогі фашызму.

Парлямант не патрэбен для людзей, якія маюць свае скрытыя мэты. Ён перашкаджае іх намерам. А намеры гэтыя лежаць ў галіне ня так унутранай, як замежнай палітыкі.

Замежная палітыка паноў сапатараў і „Беспартыйнага блёку" мае сваёй скрытай мэтай пашырэньне тэрыторыі сучаснай Польшчы да граніцы 1772 г., г. ё. далучэньня да Польшчы Літвы, Беларусі і часткі Украіны. Гэта і зьяўляецца фактычнай праграмай „Санацыйнага абозу". Але аб гэтым паны санатары голасна гаварыць ня могуць, хоць самі ўсё добра ведаюць, што і для чаго яны ціпер нешта робяць. Яны добра ведаюць, што каб можна было лягчай справіцца з

Жыцьцё і праца асьветніка.

Удзел настаўніцтва і школы ў хлебазагатоўках.

Хлебазагатоўчая справа мае дзяржаўнае і палітычнае значэньне. Ад вырашэньня задачы хлебазагатовак і загатовак сыравіны для прамысловых прадпрыемстваў будзе залежаць тэмп нашага сацыялістычнага будаўніцтва на бліжэйшыя гады, дабрабыт працоўных мас нашай краіны, а таксама і тэмп нашага культурнага будаўніцтва. Зусім зразумела што на дапамогу хлебазагатоўкам павінны найсьці ўсе нашы жывыя сілы гораду і асабліва вёскі.

Працаўнікі савецкіх і каапэрацыйных установаў, культурныя працаўнікі на вёсцы—усе павінны прыняць самы шчыры ўдзел у дапамозе справе хлебазагатовак.

Вясковае настаўніцтва, загадчыкі хатчытальняў і нардамоў, якія непасрэдна зьвязаны з сялянствам у сваёй штодзённай працы, павінны на ўсіх сходах, у прыватных гутарках растлумачыць проста і ясна ўсё значэньне праводзімай кампаніі, растлумачыць неабходнасьць і ў будучым сваячасовага забясьпечаньня сыравінай і хлебам нашай прамысловасьці і экспорту.

Асабліва вялікую работу настаўніцтва павінна разьвярнуць у школе, а праз школу і сярод насельніцтва. Неабходна паказаць і даказаць усю шкоду, якую прыносяць самагоншчыкі дзяржаве і ўсім працоўным масам. Самагонаварэньне мае ў сучасны момант шырокі размах, прычым у самагонаварэньні часта прымаюць удзел і вучні.

Насьценныя газэты ў хатах-чытальнях і школах павінны таксама ўдзяліць належнае месца пытаньню хлебазагатовак. На бацькаўскіх сходах неабходна ставіць пытаньне аб сялянскім займе і хлебазагатоўках, абяркоўваць пытаньне аб папулярызацыі займу сярод шырокіх працоўных мас вёскі.

Жыцьцё высоўвае перад школай адно з вельмі важных і сур'ёзных грамадзкіх заданьняў. Школы і настаўніцтва павінны праявіць пасільны ўдзел. Праца будзе мець грамадзкую і пэдагагічную вартасьць.

В. С.

Школьная вучнёўская бібліятэка.

Востра і балюча стаіць у нас справа з дзіцячымі кніжніцамі пры школах. Амаль кожная школа адчувае гэту хваробу, амаль кожны настаўнік і на агульных сходах, і ў прыватных гутарках, што называецца, з больлю ў душы адзначае гэтае ненармальнае зьяўішча. У чым тут справа? І ў чым выяўляецца гэтая ненармальнасьць? А ў тым, што ў нас вельмі мала дзіцячае (вучнёўскае) літаратуры, школе неадкуль яе набыць і, такім чынам, школа ня можа задаволіць патрэбы вучняў. А трэба сказаць праўду, вучні крычаць: «Давай кнігу, давай літаратуру!»

Праўда, вышэйстаячыя органы, намеры магчымасьці, забясьпечваюць школы дзіцячай літаратурай, але гэта голаду не ўталяе; прычым літаратура, мусіць, не належна праглядаецца тымі, каму гэта належыць. Часта ў дзіцячых кніжках друкуюцца далёка ня дзіцячыя матар'ялы. На гэты бок трэба было-б зьвярнуць належную ўвагу. Я думаю, што па гэтаму пытаньню двух поглядаў быць ня можа, а калі ёсьць, пажадана пачуць.

Значыцца, у нас адчуваецца недахоп дзіцячай літаратуры, і яна вельмі патрэбна. Па ёй павінна выхоўвацца наш маладняк, наш будаўнік будучыны; трэба даць яму аружжа ў рукі. Але вось бяда, хто гэта павінен даць? На мой погляд, гэту задачу можа з посьпехам разьвязаць наша літаратурная сіла, а яе хапае. Трэба толькі пажадаць аднаго, каб апавяданьні, вершы, байкі і інш. для дзяцей пісаліся простаю дзіцячаю моваю, бо такія парлы, як неба загаялася, месяц ажарабіўся, карова каля клёпу плакала ці маліласяся, сырадоем умыюся, могуць выклікаць абурэньне з боку самае каровы, і яна разам з «раніцаю», як зарыкае, тады страх ахопіць усё жывое,—дзецям, бедным, больш усіх дастанецца... Што будзе з іх нэрвамі? На маю заўвагу могуць сказаць, што такое літаратуры ня трэба даваць дзецям. Згаджаюся. Тады паўстае пытаньне, для каго-ж такі яна пішацца? Хто чытаў? Няўжо філёзаф? Ня верыцца. Адгэтуль сам напрашваецца вывад: 1) забясьпечваць школы належнай дзіцячай літаратурай, 2) літаратурным сілам заняцца справай дзіцячых бібліятэк, 3) мова павінна быць простая і жывая, 4) на школы, якія слаба забясьпечаны літаратурай, зьвярнуць належную ўвагу, каму гэта след і 5) выканаць пералічанае. Вось прыблізна тое аб чым плача вясковая школа, а з ёю разам і настаўнік.

Антон Лёсік.

Вайсковая справа ў вясковых школах.

Пытаньне аб увядзеньні ў школах фізвыху з ухілам вайсковым павінна заняць належнае месца ў школе.

Падыходзячы да гэтага пытаньня з боку фармальнага, можа паказацца, што гэту справу правесьці цяжка.

Праўда,—нельга сказаць, што нашы вясковыя школы маюць належныя будынкі, дзе-б магчыма было разгарнуць гэтую працу.

Да таго-ж шмат з настаўнікаў незнаёмы самі з вайсковаю справаю, з тым, як наладзіць фізвых..

Але пры жаданьні магчыма ўсё зрабіць.

Першае, маецца праграма НКА, дзе зьмешчана і праграма па фізвыху асобна на групах.

Другое—там, дзе ёсьць піанэратрад, можна ўмовіцца з важатым, які зможа ў гэтым дапамагчы.

Калі-ж ня маецца атраду Ю. П., то знойдзецца дэмабілізаваны чырвонаармеец ці пераменьнік, які таксама зможа дапамагчы ў справе фізвыху і вайсковых ведаў.

Што тычыцца будынку, то я скажу ў прыватнасьці, як прыходзіцца праводзіць гэтую працу.

Першае. Выбіраецца цёплы дзень, і тады займаемся на дварэ, нарыхтоўка, вольныя рухі і г. д. Калі-ж пагода дрэнная, то прыходзіцца групу падзяляць на дзьве або 3 часткі і займацца ў клясе.

Часопісь «Осо-Авиохим» можа шмат дапамагчы, але, на вялікі жаль, школы яго не атрымліваюць. Трэба нашым райвыканкомам паклапаціцца аб гэтым.

Наогул трэба сказаць, што нашаю райінспэктураю не зварочваецца на гэта ўвагі, і калі паглядзець, як абстаіць справа ў школах па ваенізацыі, то ўбачым, што 99 проц. школ гэтай працы зусім не праводзяць.

Пажадана было-б пачуць думку настаўніцтва па гэтаму пытаньню.

Н. К. Кастрыцкі.

Падагулілі паўгадавую працу.

(А.-Гарадзецкі р-н, Меншчына).

АКТЫЎНАСЬЦЬ ВЫРАСЛА.

Частыя сходы і канфэрэнцыі асьветнікаў, як было ў мінулыя гады, не давалі такіх вынікаў, якія мы бачым ад райённага сходу і канфэрэнцыі ў палове гэтага навучальнага году. Ня гледзячы на тое, што канфэрэнцыя адбылася ў час зімовага перапынку працы ў школе, прысутнасьць асьветнікаў была значная, а выяўленая актыўнасьць надзвычайная.

Специфічныя, пакуль што, умовы жыцьця асьветнікаў у працягу трох дзён на канфэрэнцыі, як салома, цікавыя спосабы падарожжа і інш. анёры, не пашкодзілі прападзольнасьці асьветнікаў. Пытаньні прафсаюзнага сходу і вытворчай канфэрэнцыі вырашаны хутка і дакладна.

ВЫВУЧАЕМ ПАСТАНОВЫ ПАРТЗЬЕЗДАЎ, ПРАВОДЗІМ ІХ У ЖЫЦЬЦЁ.

Прафсаюзны сход меў на ўвазе высьветліць пытаньне „15 партзьезд", а ў сувязі з гэтым і сучасны палітычны момант, а таксама вырашыць арганізацыйныя пытаньні прафсаюзнай працы асьветнікаў у райёне.

Па дакладу аб 15 партзьезьдзе, яго пастановах і дырэктывах значная частка асьветнікаў выявіла пазнаёмленае сталае знаёмства з пытаньнем. Аднак выпесена пастанова аб дэтальным вывучэньні гэткага пытаньня ў падрайённых гурткох.

Адначасна партзьездам неабходнасьць рашучага павялічэньня культурнага ўзроўню насельніцтва, лягла ў аснову плану працы на бліжэйшыя паўгода.

Да таго-ж, выяўлена патрэба сьпісклага вучоту масавай культасьветнай і грамадзкай працы.

Вельмі прыемнае ўражаньне стварылася ад хуткага вырашэньня пытаньня аб перадачы функцый па выдачы пэнсіі асьветнікам у касу ашчадкасьці.

МЭТБЮРО ДАПАМАГЛО ВЫТВОРЧАСЬЦІ.

Вытворчая канфэрэнцыя, як вынік плянавай працы райённага мэтадычнага бюро ў папярэднім і гэтым навучальным годзе, дала багаты і цікавы матар'ял.

З настаўлоых на разгляд пытаньняў трэба адзначыць тэхнічныя навыкі, карысна-грамадзкую працу і краязнаўства. Становішча тэхнічных навыкаў разглядалася, як гаворачы пункт пэдаму падрайёну, і лічыцца здавальняючым. Праца настаўніцтва ў працягу двух апошніх год у напрамку падвышэньня кваліфікацыі вывучэньнем мэтодыкі чытаньня, пісьма і лічэньня належным чынам і выяўляецца. Адзначаны, відомыя ўсяму настаўніцтву, перашкоды, для дасягненьня лепшых вынікаў па тэхнічных навыках—недахоп пісьмовых прыладаў, падручнікаў, кароткі навучальны год.

БОЛЬШ УВАГІ ГРАМАДЗКА-КАРЫСНАЙ ПРАЦЫ.

Вывучэньню пытаньня аб карысна грамадзкай працы школы канфэрэнцыя аддала шмат увагі і вынвіла пэдагагічную сьвядомасьць. Карысна-грамадзкая праца школы паставоўнай канфэрэнцыі ставіцца ў цесную сувязь з агульным плянам культурнага будаўніцтва ў вёсцы. Выказаны пажаданьні аб лепшым вучоце карысна-грамадзкай працы школ.

ПАГЛЫБІМ КРАЯЗНАЎЧУЮ ПРАЦУ.

Краязнаўства, наогул, і краязнаўчая праца школ у Астр.-Гарадзецкім райёне, як таповым на краявіду, па прыродна-географічных і эканамічных абставінах, з яго Лысай Гарой, а з культурна-гістарычнага боку—з яго замчышчамі, курганамі і інш. помнікамі старасьвеччыны,—зьяўляецца вельмі цікавым пытаньнем. Школа на трэцім годзе працы па комплексных праграмах, калі навучаньне ідзе галоўным чынам на краязнаўчым матар'яле, пазапасілі гэтага матар'ялу.

Асьветнікі абмеркаваньне гэтага пытаньня зрабілі разам з райённым краязнаўчым таварыствам. У выніках працы канфэрэнцыі вынесена пастанова на арганізацыі краязнаўчых музэяў у школах і райёнах. Заснавана два фэналёгічных пункты, у м. А.-Гарадок і на Лысай гары.

НАВУЧАЛЬНЫ ГОД ПАВЯЛІЧЫЎСЯ.

Райінспэктар усебакова абмаляваў становішча школ райёну. Навучальны год пачаўся 1-15 кастрычніка. Гэта дасягненьне, у параўнаньні з мінулымі гадамі, ёсьць вынік падрыхтоўчай кампаніі.

Аднак выказана пажаданьне дасягнуць яшчэ раней шага пачатку працы ў школах. Усесагульнае навучаньне для 8-хгадовага прыходзіцца на 15 школах мае хібу: значны процант дзяцей—ад 10 да 20, у школы не зьявіліся. Навучальная частка ў школах, ня прымаючы пад увагу недаховаў, залежных ад сродкаў, лічыцца здавальняючай. Праца пашыраных пэдсаветаў наладжана.

З апалам у школах зусім дрэнна. Самым цікавым момантам у гаспадарчым жыцьці школ зьяўляецца апал. Як выявілася, апалу ў школах можа хапіць толькі на студзень месяц.

НАСТАЎНІК.

АД РЭДАКЦЫІ: з матар'ялу, які маюцца ў рэдакцыі, відаць, што з апалам ЗУСІМ ДРЭННА ня толькі ў Астрашыцка-Гарадзецкім райёне, а і ў шмат іншых райёнах і округах.

Чакаем тлумачэньня па гэтаму пытаньню ад Наркамасьветы.

Ну і Васіль!..

(З ЦІХІХ ГУТАРАК НА КАНФЭРЭНЦЫІ).

Настаўнік, в пэўнай велічыні торбай за плячыма і арэхавым прутам у руках, паволі па рыхламу сьнегу набліжаецца да будынку райённай сямігодкі. Каля ганку сустракаецца з настаўніцамі.

— Бачыш, Жэня, і Васіль аж 12 вёрст пехатой прыдзігаў...

— Што, можа, спазьніўся? Якая гадзіна?

— А не, яшчэ не пачалі. Але зараз, казалі, а 2 гадзіне.

— Што гэта ты прынёр у торбе? —пытае падшэўны адказны сакратар РМК.

— Ці-ж ня ведаеш, што ў буфэце каапэрацыі не дастаць шклянкі гарбаты, а іншае не па кішэні, дык лепш з сабою і акрайчык хлеба з салам і чайнік з кубкам...

Тым часам, пасьля працы, настаўнікі мосьцяцца спаць.

— Ты куды цягнеш, пакінь саломы хоць пад галаву.

Ляглі. Гамоняць. Мяркуюць, што праэкт калдагавору ЦП магчыма будзе правесьці ў жыцьцё не раней, хіба, як у 1932 г.

— Пакладзі ногі, што ты задраў іх уверх. Хто гэта?

— Гэта-ж Васіль, надзеўшы новыя штаны, ня хоча класьці ногі на ячную салому; асьця кажа, ня выбярэш—тлумачыць сусед.

— Э, нічога, браткі, калі паляжу пару начэй дагары нагамі. А вось пытаньне з апалам у школах, дык цэлую гэту зіму дагары нагамі стаіць і хоць-бы што.

— Ну і Васіль!...

Цішэй аб апале, а то пачуе РСІ.

Бывалы.

Ц. Д. Асьветы ўзварухнуўся.

У апошнія часы Ц. Д. Працасьветы, той самы дом, які на працягу гадоў спаў летаргічным сном, пачаў выяўляць адзнакі жыцьця.

Дзякуючы адміністрацыі Дому, а таксама і новаму складу праўленьня яго, праца існаваўшых на паперы, а то і проста быўшых ў празкце гурткоў і камісіяў, у добры час кажучы, пашла галёпам. Добра працуе гурток кройкі і шыцьця, хоць кожны сябра яго і павінен уносіць ў скарбніцу Дому па паўтара рублі за свой удзел, зашавяліўся і быццам пачаў длубацца ў сваёй працы драм-гурток, здаецца, распрацоўвае «Ночь под рождество»—па Гогалю.

Пэдагбінет, дык той амаль штодня разглядае і вырашае пэдагагічныя пытаньні па ўсіх галінах будаўніцтва і працы нашае савецкае школы пры непасрэдным удзеле настаўніцтва і інспэктуры як акруговай, так і Наркамасьветы. Більярд, хатні „тэніс", чытальня і іншыя магчымасьці разумпага адпачынку на крысе пачынаюць ўцягваць і асьветніцкую масу, пакуль што моладзь, а з часам, мабыць, захопяць і старых.

Самым старанным з гурткоў—гэта гурток Осоавіяхіму.

Страляюць хлапцы, мужчыны, кабеты і дзяўчаты. Страляюць надзвычайна ўдала і з захапленьнем, можа і занадта метка.

— На дзіях адзін з адказных кіраўнікоў працай Дому чуць не запланіў га гэта сваім жыцьцём.

Адна з дранкулек папала замест мішэні яму ў плячо і дапынулася пад разрыною, так што дастаць яе, не сапсаваўшы рабыны, нельга.

Але гэтая неасьцярожнасьць павінна стаць перасьцярогай на далейшы час, і паказаць, што да страляніны патрэбна адносіцца больш уважліва.

Выкінуўшы гэтае здарэньне, можна сказаць, што асьветніцкі муравейнік пачынае шавяліцца.

М.

Дзякуем за газу.

(Талочынскі райён, Аршаншчына).

Да 1926-27 навучальнага году школы Талочынскага райёну ня мелі шчасьця атрымоўваць сродкі на асьветленьне. У 26-27 годзе Талочынскі РВК зьмілаваўся і адпусьціў на гэта сродкі, а загадчык райана т. Сучко вельмі „добра" скарыстаў іх. Без усякай згоды з настаўніцтвам ён закупіў у студзені месяца 1927 г. у Талочынскім спажывецкім т-ве газы па адному пуду для аднакамплектавых і па 1 з пал. пуды для двухкамплектавых школ райёну. Гэту газу прышлося школам атрымаць натурай у Талочыне. Як відома, невялікая школа і ні адзін настаўнік ня маюць часу, якая зьмясьціла-б 1—1½ пуды газы. З прычыны гэтага кожнаму прышлося доўга шукаць часу, а потым яшчэ наняць падводу, каб даставіць да школы ў той час, як у сваім бліжэйшым каапэратыве ён мог атрымаць газу без усякіх турбот.

Але ў гатым яшчэ біды ня так многа. Бяда ў тым, што школьны пераніс высьветліў падрабязнасьці закупкі газы. 11-га сьнежня, на настаўніцкай канфэрэнцыі, т. Сучко, пры інструктаваньні настаўнікаў да правядзельня школьнага перапісу, паведаміў, што пры складаньні бюджэту школ трэба мець на ўвазе, што за купленую газу для школ у 1926-27 годзе ён плаціў па 11 капеек фунт, з прычыны адсутнасьці газы ў нашым райёне ў час закуп і.

Дзядзька Сучко, мусіць, забыўся, як школы цэлымі галамі асьвятляліся лучынай і маглі лёгка пераняць двухтыдневы недахоп газы. Ці можа ён думаў, што ў СССР ужо зусім зьнікла газа, і паклапаціўся забясьпечыць ёю на спэкуляцыйных цэнах свае школы!

У гатым годзе яшчэ нічога невядома аб водпуску сродкаў на асьветленьне школ. Трэба было-б паклапаціцца каму належыць, каб сродкі гэтыя пасылалі на карысьць школам, а не спэкулянтам.

Настаўнік.

2-гі УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД МОПР'у.

(Пасяджэньні 29 і 30 студзеня).

ПРЫВІТАНЬНІ І ПАДАРУНКІ.

Лепшым доказам салідарнасьці рабочае клясы і прапоўнага сялянства з міжнародным пралетарыятам у яго барацьбе з капіталам зьяўляюцца тыя прывітаньні і падарункі, які адбываліся на працягу ўсёй працы ўсебеларускага зьезду Мопр'у.

З прывітаньнем ад Крычаўскае арганізацыі Мопр'у выступіў **т. Левін**, які пасьля прамовы пад бурныя воплескі перадаў зьезду цэлую кучу розных вышытых сарочак і інш. бялізны, зробленай сялянкамі спэцыяльна для палітычных вязьняў у буржуазных турмах. Гэты падарунак т. Левін ад імя сялян прасіў перадаць палітзьняволеным. Апрача гэтага, тав. Левін перадаў зьезду зроблены кавалём молат і нож.

— Гэты молат і нож,—кажа Левін, —каваль прасіў перадаць для зьнішчэньня буржуазеі (бурныя воплескі).

Далей з прывітаньнем выступіў селянін Чачэвіцкага райёну (Маг. акр.) **Дзергачоў**, які запаўніў зьезд, што сялянства будзе напырацъ і ўзмацняць шэрагі Мопр'у.

Тав. Дульская (Віцебскі скураны завод) перадала зьезду цэлы пак бялізны, пашытай работніцамі для палітзьняволеных.

Ад імя рабочых г. Барысава тав. Помпор перадаў зьезду 300 рублёў.

Рабочы - мэталіст з г. Віцебску **т. Шыдлоўскі** ў сваёй прывітальнай прамове сказаў, што віцебскія мэталісты рыхтуюць цэлы шэраг падарункаў для палітзьняволеных.

Акраяя гэтага, зьезд віталі многія іншыя арганізацыі, перадаючы адначасова грошы і рэчы для дапамогі палітзьняволеным.

СПРАВАЗДАЧА ЦК МОПР'у СССР.

З дакладам аб працы ЦК Мопр'у СССР выступіў **т. Зінгер**, які спыніўся на сучасных міжнародных абставінах, у якіх прыходзіцца весьці барацьбу рабочай клясе з капіталам. Дакладчык зазначыў, што за апошнія 3-4 месяцы заўважваецца асаблівае ўзмацненьне белага тэрору. На першым месцы ў гэтай справе ідзе Польшча (справа Беларускае Грамады інш.), за Польшай ідзе Італія (справы—у Міляне 54 і ў Рыме 83), за Італіяй ідуць Румынія, Вэнгрыя, Баўгарыя. Не адстаюць у белым тэроры і Францыя з Амэрыкай. Буржуазея ўжывае суровы тэрор для таго, каб зусім задавіць рэвалюцыйны рух рабочае клясы.

За 1925, 1926 і палову 27 году палітзьняволеныя ўсіх краёў атрымалі ад Мопр'у 2600000 р. дапамогі. З гэтай сумы 2100000 р. даў СССР, рэшту далі ўсе іншыя краіны сьвету.

Зараз у СССР (па няпоўных даных) налічваецца 3500000 членаў Мопр'у, з іх: рабочых—38 проц., сялян—17 пр., чырвонаармейцаў, вучняў і служачых—15 пр.

За апошнія гады ЦК Мопр'у ў сваёй працы зварачваў асаблівую ўвагу на афармленьне і ўзмацненьне Мопр'аўскіх арганізацый і ячэек. Таксама трымаўся курс на павялічэньне Мопр'аўскага актыву, якога зараз на СССР налічваецца 100000 чал.

Беларусь стаіць на першым месцы ў СССР па працы Мопр'у ў вёсцы.

У заключэньне т. Зінгер падкрэсьліў неабходнасьць узмацненьня палітычнай і выхаваўчай працы сярод членаў Мопр'у.

— **Ленін вучыў, кажа т. Зінгер, што пралетарыят, які перамог у аднэй краіне, павінен дапамагаць барцам рэвалюцыі ўсіх капіталістычных краін. Гэта наша асноўная задача і мы яе ажыцьцяўляем.**

СПРАВАЗДАЧА ЦК МОПР'у БССР.

Справаздачу аб дзейнасьці ЦК Мопр'у БССР зрабіў т. **Калмык**.

Уся праца ЦК праводзілася па аснова дэрэктыў І усебеларускага зьезду Мопр'у і пленумаў ЦК. За 3 апошнія гады ў працы Мопр'у на Беларусі ёсьць вялікія дасягненьні. Перш за ўсё, была праведзена вялікая праца па арганізацыйным афармленьні Мопр'аўскіх ячэек і нізавых к-таў. Узмацнялася Мопр'аўская праца і шляхам перавыбараў нізавых ячэек Мопр'у.

Зараз у БССР налічваецца каля 170000 членаў Мопр'у. Рост быў значны пераважна за кошт рабочых і прапоўнага сялянства, і дырэктыва аб уцягненьні сялянства ў Мопр у асноўным выканана.

Важна тое, што акруговыя камітэты Мопр'у навучыліся плянава працаваць. У райёнах з плянавасьцю справа горш. Актыў узрастаў, галоўным чынам, за кошт рабочых і сялян. Дырэктывы ЦК на месцах выконваліся недастаткова. Рэвкамісіі працавалі слаба, а ў райёнах зусім спалі. Мопр'аўскія ячэйкі на вёсцы малажыцьцёвыя—іх трэба ажывіць. Падобныя зьявішчы можна назіраць і ў райёнах.

Вечар кастрычніка-вага прызыву.

(28 студзеня, клюб К. Маркса).

Клюб Карла Маркса быў бітком набіт лепшымі рабочымі г. Менску, уступіўшымі ў камуністычную партыю на кастрычнікавану прызыву. Сабраліся яны сюды, каб лепш адзін з другім пазнаёміцца.

Вечар адчыніў **т. Гершан** і прадаставіў слова сакратару АК КПБ т. Якуліку.

— Кастрычнікавы прызыў, кажа т. Акулік, зьявіўся лепшым адказам на вылазкі апазіцыі, тысячным уступленьнем у камуністычную партыю. Зараз перад кастрычнікавым прызывам стаіць асноўная задача—дагнаць і зраўняцца з усёй партарганізацыяй. З кожнага вас трэба зрабіць моцнага бальшавіка-ленінца, а пагэтаму трэба сур'ёзна ўзяцца за ленінскае выхаваньне—вучобу. Заканчываючы сваю прамову т. Акулік сказаў—наша партыя атрымала падмацненьне. Мы зараз разам з ім пойдзем да новых дасягненьняў.

Прамова т. Акуліка закончылася бурнымі воплескамі.

Было і многа прысутных. Вечар прайшоў жыва. Была добрая канцэртная пастаноўка, якая насіла разнастайны характар з удзелам партыйнай і камсамольнай кастрычнікавага прызыву. На настрою масы магчыма было зрабіць вывад, што яна здаволена гэтым вечарам. Гэткія вечары ў далейшым трэба пераносіць у ячэйкі, дзе можна чакаць больш самадзейнасьці.

60-гадовы юбілей таварыства менскіх дактароў.

У 12 гадзін дня 29-га студзеня ў актавай залі Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту адбылося ўрачыстае пасяджэньне Навуковага Таварыства менскіх дактароў.

Прысутнічалі прадстаўнікі партыйных, савецкіх, прафэсыянальных і грамадзкіх арганізацый.

Адчыняючы сход, старшыня таварыства праф. **Цітаў** у кароткай прамове падкрэсьліў ролю медыцынны наогул і таварыства ў прыватнасьці. У кароткіх рысах ён спыніўся на тым шляху, які прайшло таварыства за 60 гадоў.

Датыкаючыся гісторыі таварыства, ён зазначыў, што сярод членаў гэтага таварыства ёсьць адзін з заснавацеляў яго, які яшчэ жыве і зараз прысутнічае на пасяджэньні, гэта доктар О.Л. Лунц. Сход паладзіў шумную авацыю гэтаму старэйшаму доктару г. Менску.

Старшыня ў сваёй прамове падкрэсьліў, што таварыства мае тэндэнцыю ўвайсьці ў навуковую асацыяцыю дактароў, якая ў хуткім часе будзе арганізавана пры саюзе мэдсанпрацы.

— Таварыства,—кажа праф. Цітаў, —разьвівае сваю дзейнасьць дзякуючы кіраўніцтву камуністычнай партыі і савецкае улады. Я, як старшыня таварыства, магу сьмела выказаць шчырую падзяку камуністычнай партыі і савецкай уладзе за ўсямерную дапамогу таварыству і ўсялякае падахвочваньне да працы.

З прывітальнымі прамовамі выступалі **т. т. Чарвякоў, Ігнатоўскі, Цынцыпэр**—старшыня саюзу мэдсанпрацы, **Маршак**—старшыня мэдычнае сэкцыі, праф. **Пічэта**, праф. **Вальфсон** і інш. Прамоўцы адзначылі вялікія заслугі т-ва ў мінулым і ў сучасны момант.

З прывітаньнем выступаў і прадстаўнік ад студэнтаў-мэдыкаў. Студэнцтва выказвае падзяку таварыству за тое, што таварыства пашырае свае спэцыяльныя веды сярод студэнцтва, якое будзе сеяць гэтыя веды ў беларускай вёсцы.

Таварыства атрымала шмат прывітальных тэлеграм ад розных мэдыцынскіх таварыстваў і гурткоў.

Сэкратар таварыства **М. А. Поляк** у справаздачы аб 60-цігадовай дзейнасьці таварыства дакладна агледзеў усе этапы т-ва. Гэта яму добра вядома, бо сэкратаром таварыства ён быў 24 гады. У пачатку таварыства мела розныя функцыі: апрача навуковай работы, яно выконвала ролю прафэсыянальнага органу, імкнулася да выкананьня этычных заданьняў і інш. У сучасны момант, калі ёсьць прафсаюз і мэдычная сэкцыя, гэтыя функцыі ад таварыства адпадаюць.

За апошнія 6 гадоў таварыства вядзе выключна навуковую працу і побач з гэтым займаецца пытаньнямі эпідэміолёгіі, грамадзкае мэдыцыны і краязнаўства.

— Праца таварыства,—кажа т. Поляк,—стала асабліва карыснай пасьля прыходу ў Менск савецкае ўлады і пасьля таго, як яна прыступіла да мірнага будаўніцтва.

Урэшце, старшыня таварыства праф Цітаў абвясьціў, што таварыства выбрала сваімі ганаровымі сябрамі двох найстарэйшых таварышоў—М. А. Поляка і С.В. Балкаўца, якія ў працягу шэрагу год усямерна дапамагалі разьвіцьцю таварыства.

Перад 10-ай гадавінай Чырвонай арміі.

Сьвята Чырвонай арміі--будзе сьвятам усіх працоўных.

(Ліст з Бабруйску).

Падрыхтоўка да 10 гадавіны Чырвонай арміі па акрузе ў сучасны момант прыняла шырокі размах. Да гэтага сьвята рыхтуецца сама Чырвоная армія, рыхтуецца горад, рыхтуецца вёска. Ставіцца агульная мэта: як найлепш адсьвяткаваць гэта вялікае сьвята нашай Чырвонай арміі, правесьці гэтае сьвята ў цесным арганізаваным саюзе працоўных з чырвонаармейцамі.

№-скі корпус распрацаваў падрабязны плян правядзеньня сьвята. Па асобных частках корпусу будуць арганізаваны спэцыяльныя выстаўкі. У ленінскіх куткох і клюбах будуць наладжаны вечары. На гэтых вечарох вэтэраны арміі і ўдзельнікі грамадзянскай вайны выступяць з успамінамі аб мінулым. У дні сьвята будзе праведзена ўшанаваньне старэйшых працаўнікоў Чырвонай арміі. Вечары чырвонаармейскай творчасьці, выстаўкі насьценных газэт, кіно-пастаноўкі будуць праведзены ў масавым парадку. Будуць праведзены вечары сумесна з сялянствам і рабочымі. Радыё таксама будзе скарыстана на ўсе сто процантаў для прыёмкі радыё-газэт і канцэртаў у дні сьвята. Апрача таго, маркуецца правядзеньне некалькіх конкурсаў на лепшы вайсковы куток, на лепшага повара і г. д.

Надзвычайныя вёскі і заводы прымуць актыўны ўдзел у сьвяткаваньні дасягнецігодзьдзя Чырвонае арміі.

Вайсковай сэкцыяй Мопру будзе прынята шэфства над палітвязьнямі адной з турмаў капіталістычных дзяржаў і г. д.

У Жлобінскім райёне распачалася сур'ёзная падрыхтоўка да сьвята. Даклады аб значэньні Чырвонай арміі праводзяцца амаль што ва ўсіх буйных пунктах. Арганізоўваюцца спэцыяльныя бібліятэкі і выстаўкі кніжак аб Чырвонай арміі. Сярод насельніцтва арганізоўваецца збор падарункаў для Чырвонай арміі. Па вёсках арганізоўваюцца сходы дэмабілізаваных чырвонаармейцаў, на якіх будуць абгаварвацца пытаньні аб практычным удзеле запасьніка ў справе ваенізацыі насельніцтва.

У дні самога сьвяткаваньня ў Жлобіне арганізоўваецца шырокая дэманстрацыя працоўных, у якой будуць удзельнічаць атрады ТДА-Авіяхіму, вайсковыя гурткі, санітарныя, спартыўныя гурткі. Будуць наладжаны таксама і розныя спаборніцтвы.

Акрсавет да сьвята мяркуе скончыць конкурс на лепшую ячэйку ТДА-Авіяхіму, і ў гэты дзень будуць выданы прэміі лепшым ячэйкам.

У Бабруйску абсталёван **Дом Абароны**. У дзень 10-годзьдзя Чырвонае арміі адбудзецца яго адчыненьне.

А. Дамброўскі.

Будзем вывучаць родную мову.

(№-ы кавполк).

Пры фармаваньні нашай палкавой школы, акрамя велікарусаў са ўсіх эскадронаў №-га кавпалка і часткова з №-ай стралковай дывізіі,—у школу ўлілася значная колькасьць беларусаў. Ня так даўно ў школе было ўзьнята пытаньне парт'ячэйкай аб правядзеньні працы сярод курсантаў-беларусаў на беларускай мове. Курсарны-падтрымалі гэтую думку і выказалі жаданьне вывучаць родную беларускую мову і запяцца вывучэньнем роднай краіны БССР.

Насьценгазэта, якая выдаецца пры школе, таксама дае старонку для матар'ялаў па беларускай мове.

У лепкутку маецца частка беларускіх кніжак, якія і абслугоўваюць курсантаў-беларусаў. У хуткім часе мяркуецца арганізаваць беларускі гурток.

Янка Шаірка.

Шэф, падцягніся!

(Асобны конна-сапёрны эскадрон).

Над асобным конна-сапёрным эскадронам шэфствуе Новабеліцкі сьпіртнаводачны завод і ў дадатак к гэтаму мясцком саюзу працасьветы. Здавалася-б, што тут магло быць шэфства і культурнае, і матар'яльнае, і сувязь з рабочай масай і г. д.

Але, шэфская справа абстаіць дрэнна. Наконт культуры шэфства саюзу працасьветы можна сказаць, што эскадрон трымае культурнае шэфства над саюзам а не працаўнікі асьветы над эскадронам.

Ня гледзячы на ўсе патугі чырвонаармейцаў, «культурны» шэф ані з месца.

Другі шэф, таксама не далёка адыйшоў, але справа тут абстаіць хоць трошкі лепей. Трэба працаўнікоў асьветы падцягнуцца і не забываць, што сувязь з Чырвонай арміяй, асабліва ў наш век, ня толькі праца «паміж іншым», а найважнейшая задача.

Чангарац.

Рыхтуемся да 10-цігодзьдзя.

(№ стр. полк, гор. Менск).

У нашым палку падрыхтоўчая праца да 10-годзьдзя Чырвонай арміі пачалася даўно.

Чырвонаармейцы рашылі зрабіць свае падарункі.

У адноэй роце група няпісьменных мяркуе скончыць ліквідацыю няпісьменнасьці да 10 гадавіны Чырвонай арміі.

Другая рота думае дабіцца 100 проц. выкананьня на стральбе, для чаго ў пазашкольны час праводзіць падрыхтоўчую працу.

Вайскоры таксама выкінулі лёзунг: «Выйсьці на першае месца ў справе выданьня пасьцелных газэт у дывізіі».

Трэба адзначыць, што наш полк па колькасьці карэспандэнцый у газэту Б.В.А. за апошнія 3 месяцы стаіць на першым месцы.

Другім лёзунгам вайскораў зьяўляецца: «Як мага лепш правесьці перакліч з Украінскай Вайсковай Акругай».

С. К.

Падрыхтоўваем юбілейную часопісь

(№ стр. полк., гор. Чэрвень).

Для правядзеньня юбілею Чырвонай арміі у Н м палку складзена палкавая камісія, а таксама складзены камісіі і ў падразьдзелах палка.

Палкавая камісія трымае цесную сувязь з мясцовымі ўстановымі і грамадзкімі арганізацыямі.

Сьвята 10-ай гадавіны Чырвонай арміі будзе праходзіць пад знакам дэманстрацыі нашай баяздольнасьці, нашых культурных дасягненьняў; пад лёзунгам цеснай сувязі Чырвонай арміі з працоўнымі масамі; пад знакам шчыльнага зьяднаньня паміж байцамі і кампалітскладам.

Усім вэтэранам палка камісія даручыла напісаць артыкулы аб узьлеце іх у бойках грамадзянскай вайны і наогул асобныя малюнкі барацьбы з контр-рэвалюцыяй.

З гэтага матар'ялу будзе складзена **юбілейная часопісь**, зьвязаная з гістарычным мінулым палка. Ячэйкай ТДА-Авіяхіму будзе прачытан цэлы шэраг лекцый па гісторыі палка як для чырвонаармейцаў, так і для грамадзкіх арганізацый. Будзе распрацавана інсцэніроўка. Мяркуецца прапаўдзеньне цэлага шэрагу конкурсаў: на лепшага чырвонаармейца, на лепшую працу вайскораўскага гуртка і г. д. Бібліятэкай ужо падрыхтавана выстаўка кніжак па гісторыі і бараньбе Чырвонай арміі.

Н. Б.

З культурнага жыцьця Савецкай Украіны.

Літаратурны будынак імя В. Блакітнага разьвінуў шырокую культурна-грамадзкую работу. Штодня ў будынку бывае каля 100 гасьцей, а ў дні масавай работы (субота, нядзеля, панядзелак,— па 200-300 асоб. Бібліятэка будынку налічвае звыш 5000 томаў; гэта ўсё мастацкая літаратура—украінская, расейская і замежная. Багата ёсьць кніг на французкай, нямецкай і анґельскай мовах. Бібліятэка атрымлівае п-заграніцы часопісі з Францыі, Нямеччыны, Польшчы, Амэрыкі, Англіі, Японіі.

Літаратурны будынак налічвае зараз каля 350 членаў, з іх пісьменьнікаў—44 пр., журналістаў—28 проц., мастакоў і артыстаў—10 проц. Цікава, што жаночы ня шмат, усяго 10 процантаў. З вышэйшай асьветай ёсьць 38 проц. членаў, з сярэдняй—46 проц. Вялікая колькасьць членаў клюбу—партыйныя (члены кампартыі і камсам

Вёска сёньня.

ВАЛАКІТА У ЗЕМЛЯЎПАРАДКАВАНЬНІ.

Земляўпарадкаваццa сяляне в. Рудня-Альхоўкі задумалі яшчэ ў 1921 годзе, таму што гаспадарыць так далей было немагчыма, зямля была раскінута на адлегласьці 5 вёрст ад вёскі, кожны гаспадар меў па 70-75 кавалкаў зямлі шырынёй па мэтру.

Але не пакутру гэта было вясковым кулакам, і яны пачалі судзіцца з беднякамі, чаму цягнулі і валынілі гэту справу да 1925 году. Урэшце, у 1925 годзе ўсе суды скончыліся ў карысьць беднякоў. Сабралі грошы, заплацілі за земляўпарадкаваньне, сталі чакаць каморнікаў. Каморнікаў дачакаліся ўвосень 1925 году, яны абышлі межы, а тут пачалася зіма, яны і пасхалі, сказаўшы, што канчаць земляўпарадкаваньне прыедуць вясной 1926 году. Прышла вясна, каморнікаў няма. Упаўнаважаныя сталі абіваць парогі рачэйшага УЗУ, каб яно выслала каморнікаў канчаць земляўпарадкаваньне. Нарэшце, пасьля доўгіх хаджэньняў выслалі каморнікаў восьпьню 1926 г. Зямля была адзмерана і намечана з вёскі Р.-Альхоўка выдзяліць 6 пасёлкаў і 2 хутары. Як вядома, зямля бывае лепшая і горшая. На лепшую зямлю ўтайку падпісаліся сельсаветчыкі са сваімі сватамі, братамі ды прыяцелі каморнікаў, а на горшую людзі пісацца не хацелі, а засяляць яе трэба. Каморнікі склікалі пасяджэньне сельсавету, на якім пастанавілі выселіць сілай на пасёлак «Заподзе» і «Жытлёнка» 23 гаспадары з 114 душамі. Сяляне, якіх сілай запісалі на пасёлак, падалі скаргу ў З. А. Справа гэта ў Акр. З. А. разьбіралася 20 красавіка 1927 году. Акр. З. А., разабраўшы гэтую справу, пастанавіў сілай сялян не высяляць і пастанавіў зацьвердзіць з намечаных 6 пасёлкаў толькі 3, а астатнія 3 земляўпарадкаваць да 30 чэрвеня 1927 году.

Прайшоў гэты час, няма каморнікаў, ізноў сталі ўпаўнаважаныя абіваць парогі Акр. З. А. Хадзілі 13 раз і нам адказвалі: «прыяжджайце за каморнікам праз тыдзень». Два разы пасылалі падводу за каморнікам. Нарэшце, 12 кастрычніка 1927 году, каморнік зьявіўся разлаваны і сказаў, што п. «Заподзе» ня будзе, хоць ён і адрэзан ад вёскі пяском і знаходзіцца ад яе на адлегласьці 3-х вёрст, а будзе пасёлак «Жытлёнка» (які знаходзіцца на адлегласьці 1 з паловай вярсты ад вёскі), а «Заподзе» далучым да п. Альхоўка. Так і зрабілі. З імі спрэчкі малыя, хоць і ў шкоду сялянству. Незадоволены пасёлак Альхоўка ізноў падаў скаргу, ізноў пачынаецца валакіта.

З прычыны гэтай валакіты сяляне сеялі жыта толькі ў канцы кастрычніка.

Земляўпарадкаўчая валакіта вёскі Р.-Альхоўка—гэта прыклад зямельных валакіт, якіх у Гомельшчыне ня мала, аб чым трэба ведаць усей Савецкай Беларусі.

Д. Духвалаў.

Р.-Альхоўка, Уваравіцкі р., Гомельшчына.

Пакрысе вылазім з цемры.

Недалёка ад сельсавету, вёрст за 6-7, упіраючыся ў лес, раскінуліся вёска Кіраёва і хутары в. Рэдзек. Сяляне гэтых вёсак жывуць у большасьці яшчэ пастарому. Газэты—ня бачаць; прабавалі некаторыя выпісваць ды і кінулі,—пошта сюды ня ходзіць, а з сельсавету калі і перадалі газэту дык да падпішчыка даходзе адзін загаловак, на дарозе яе скурываюць.

Пра шматпольле некаторыя сяляне чулі, але баяцца гэтай справы, бо аграном амаль зусім не наведвае вёскі. Моцна трымаюцца сяляне гэтых вёсак за трохпольле:

— Ня трэба нам шматпольля, дзяды нашы на трохпольлі жылі і мы жыць будзем,—кажуць некаторыя сяляне.

Моцна трымаюцца гэтаксама сяляне і за дзедаўскія звычаі: сеяць авёс трэба толькі да «Міколы», а то бог не зародзіць», жыта—на «Спаса», і што «з пуда мукі выходзіць 10 бутэлек «чыстага» самагону—сьпічкай чырк—і загарыцца».

Ніводнага сьвята ня пройдзе без самагону. Моладзь ладзіць вячоркі з п'янкай і бойкамі.

Вось што найбольш выдатнага ў жыцьці гэтых вёсак было крыху раней. Толькі ў апошні час сяляне гэтых вёсак пачынаюць варушыцца. У вёсцы Кіраёва адчынен «чырвоны куток», дзе ёсьць газэты і кніжкі, наведываюць куток моладзь і старыя. Яшчэ ў мінулым годзе сяляне хадайнічылі аб адчыненьні школы, бо няма магчымасьці дзяцей пасылаць за 7 вёрст у школу Сёлета Кіраёўцы маюць сваю школу, наведваюць якую дзеці і з вакольных вёсак, усяго ахоплена школай з 50 вучняў. У в. Рэдзькі, у якой цяжка знайсьці пісьменнага, сёлета працуе ліпкунт, наведвае які каля 40 чалавек. Вёска Рыленкі у мінулым годзе зямляўпарадкавалася, сяляне просяць, каб хоць адзін раз прыехаў аграном даць парады, як пасьля земляўпарадкаваньня паставіць гаспадарку, а аграпома усё ня чуваць. Трэба больш дапамагчы адсталым вёскам якія знаходзяцца далёка ад сельсаветаў, хат-чытальнь, пабольш выяжджаць аграномам, пашыраць газэты.

Селькор А. Зябко.

Н.-Тухінскі с.-с., Дубровенскій р., Меншчына.

Скора вёска затоне!

Вялікая і даволі заможная в. Кляніка; раскідана яна па пасёлках ды хутарох; ёсьць такія месцы, што цэлы бровар можна паставіць і дуць сярод белага дня—ніхто ня знойдзе.

Дык там і ня дзіва, але вось у самым цэнтры Кляніка, дзе і сельсавет і іншыя ўстановы—самагонакурэньне настолькі ўзрасло і пашырылася, што іж жудасьць бярэ.

Дайшло да таго, што зьявіліся «сталоўкі», нават з нумарамі, і гэтакіх сталовак налічваецца нешта каля васьмі. Кожнае сьвята тут ідзе, што называецца, разьліўное мора.

Мала гэтага. Паколькі тут у Кляніку падніяўся вялікі попыт на самагон і, панятна, збыт,—яго пачалі дастаўляць з такіх месц, як пасёлак Пацічова, в. Замосьце, Рудня, Чэрвенская райёну, і Бярозаўкі, Бярэзінскага райёну.

Адным словам,—патопа!..

Самагонщыкі дайшлі да таго, што сярод белага дня, ня кажучы ўжо аб ночы, гоняць у сваіх хлявох, дзе тутжа побач ляжыць і сена, салома, трушанка, умецьце...

Больш сьвядомая частка жыхарства вельмі абурана гэтым і паракае на сельсавет ды на міліцыю, якая, праўда, у гэтых адносінах сьпіць.

Трэба ўзварухнуцца ды так, каб зусім сьцерці з твару зямлі гэтую пошасьць.

М. Н—іч.

Смалявіцкі р., Меншчына.

Перамаглі прыватніка.

Ня гледзячы на тое, што прыватны гандаль на абшарах нашага сельсавету меў значны посьпех сярод сялянства па збыту сваіх тавараў, а таксама і ў заграбаньні да сябе сялянскіх прадуктаў, упартай добра, наладжанай працай каапэрацыі, пры дапамозе партыйнай і камсамольскай ячэйкі ўдалося павярнуць усё насельніцтва ў праціўны бок ад прыватніка—у бок каапэрацыі.

Каапэрацыя, прыгарнуўшы да сябе шырокія пласты жыхарства яшчэ шырэй і лепш разгортвае сваю працу.

Складзены каляндарны плян працы, вылучаны ўпаўнаважаныя па збору сыравіны, створаны засолачны пункт (дзе здаюцца скуры) і г. д. Усё гэта нанесла моцны, рашучы ўдар прыватнікам.

Прыватнік, убачыўшы, што перад каапэрацыяй яму больш не ўстаяць і справы яго не ў далёкай будучыні павінны рушыцца—не чакаючы апошняга моманту, пачынае распрадаваць тавары па ніжэйшай цане, зачыняе сваю краму і замест гэтага думае узяцца за здаровую працу земляроба.

Селькоры М. Алесін, і Л. Расінская.

М. Пясочна, Капыльскі райён.

У прэзыдыуме ЦВК БССР.

АБ СКЛАДЗЕ ВЫШЭЙШАГА САВЕТУ ФІЗЫЧНАЕ КУЛЬТУРЫ БССР.

Згодна пастановы прэзыдыуму ЦВК БССР ад 26 студзеня 1928 году, зацьверджан наступны склад пленуму Вышэйшага Савету Фізычнае Культуры БССР: т. т. Барсукоў, Леў, Кулак, Аніхоўскі, Падарожны, Фрыдман, Чэпко, Файнбург, Душман, Смарчкоў, Фунт і Урул. У склад пленуму Вышэйшага Савету ўваходзяць таксама прадстаўнікі ад акруг на адзнаму ад кожнай.

Склад прэзыдыуму Вышэйшага Савету Фізкультуры зацьверджан з т. т.: Барсукова (старшыня Савету), Лева (нам. старшыні), Файнбурга, Душмана, Кулака, Аніхоўскага, Фунта і Урула.

АБ ПАСЫЛЦЫ СЯЛЯН-ВЫЛУЧЭНЦАЎ НА МЕСЦЫ ДЛЯ РАСПАЎСЮДЖВАНЬНЯ ПАЗЫКІ ЎЗМАЦНЕНЬНЯ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ.

Згодна пастановы прэзыдыуму ЦВК БССР ад 26 студзеня 1928 году прызнана неабходным пасылку сялян-вылучэнцаў членаў і кандыдатаў у члены ЦВК БССР на месцы для распаўсюджваньня пазыкі ўзмацненьня сельскай гаспадаркі.

Тав. Хацкевічу даручана арганізаваць гэтую пасылку, даўшы выяжджаючым неабходныя інструкцыі і матар'ялы. Згодна паказанай пастановы, сяляне-вылучэнцы ўжо выехалі на месцы.

Мерапрыёмствы па жыльлёваму будаўніцтву.

(З рэзалюцыі па дакладу т. Карклін на пленуме ЦСПСБ).

Пленум адзначаў, што за апошнія 3 гады мелася павялічэньне асигнаваньняў на жыльлёвае будаўніцтва, што дало магчымасьць часткова паленьшыць жыльлёвае становішча рабочых. У далейшым тэмп жыльбудаўніцтва павінен быць узмоцнен, асабліва ў прамысловых раёнах. Асноўны недахоп жыльлёвага будаўніцтва—гэта дарагавізна. Пленум ЦСПСБ завастрыў увагу ўсіх прафарганізацый на неабходнасьці садзейічаньня забудоўшчыкам у справе правядзеньня ў жыцьцё пастаноў ураду аб зьніжэньні сабекошту жыльбудаўніцтва ў 28 г. ня менш, як на 15 проц., пры чым само зьніжэньне сабекошту не павінна адбівацца на якасьці будаўніцтва.

Недахопы мінулага году ў недастатковай падрыхтоўцы да будаўніцтва (нясвоячасован загатоўка матар'ялаў, рабочая сіла), павінны быць зьніжаны ў бягучым годзе.

Усе адпускаемыя сродкі і крэдыты на жыльлёвае будаўніцтва павінны расходавацца выключна на прамому прызначэньню, не дапускаючы выдаткаў гэтых сум на іншае будаўніцтва (як набудова дамоў для выканаўчых камітэтаў і іншых патрэб).

Узмацненьне жыльлёвага будаўніцтва на лініі прамысловасьці і выканкомаў не павінна паслабляць разьвіцьцё каапэратыўнага жыльбудаўніцтва. У гэту справу трэба большу цягнуць рабочыя масы, з максімальным павялічэньнем капіталаў і своячасовага крэдытаваньня на зліці камунальнага банку. Таксама пленум вывярнуў увагу на забудоўшчыкаў-рабочых (калектыўным спосабам), робячы ім усякую дапамогу, і гэтым самым ісьці насустрач ініцыятыве рабочых мас.

Пленум прызнаў правільным пастанову ўраду аб квэтэрнай плане, якая налічваецца ад сапраўдных сабекаштоўнасьці кватэр, і даручыў прэзыдыуму ЦСПСБ, на аснове вывучэньня выганьня ўдзельнае вагі кватэрнай платы ў бюджэце рабочых,—забясьпечыць удзел прафарганізацый у практычным правядзеньні ў жыцьцё гэтага закону.

Апрача гэтага, пленум завастрыў увагу ўсіх прафарганізацый на ўзмацненьне культурна-асьветнай працы сярод жыльлёў, каб яны асьцярожна адносіліся да жыльлёвай плошчы.

Пленум таксама выказаў думку аб памяншэньні платы за камунальныя ўслугі (вада, сьвет), і каб за кошт гэтага памяншэньня павялічыць накапленьне сродкаў жыльцамі на падтрыманьне іспэчагага і ўзелу ў новым жыльлёвым будаўніцтве.

ЗАЦЬВЯРДЖЭНЬНЕ КАШТАРЫСУ ЦСПСБ.

Пленум зацьвердзіў каштарыс ЦСПСБ на 1928 год у прыбытковай частцы на суму 215.000 руб., з павялічэньнем супроць мінулага году на 10 проц. З агульнай сумы зацьверджанага каштарысу пералічана ў культфонд 17.200 руб. і ў запасны фонд 10.000 руб. Усе зацьверджаныя сродкі па каштарысу размеркаваны паміж цэнтрам і акругамі.

Адміністр.-гасп. выдаткі, у параўнаньні з мінулым годам, павінны быць скарочаны на 13 проц.

Акрамя гэтага пастаноўлена: у Магілеўскай, Гомельскай і Аршанскай акругах скарацінь на адзнаму райпрафбюро. Аплату сутачных па камандзіроўках з акругі ў раёны пленум пастанавіў выплачваць з рахунку 1/48 месячнага акладу. З.

ЗАКОНЫ і ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА

Савету Народных Камісараў БССР

аб зьняцьці з тав. Карпешына, Антона Сьцяпанавіча, абавязкаў кіраўніка Беларускай Канторы Дзяржаўнага Банку, Члена Эканамічнай Нарады пры СНК БССР, Старшыні Арбітражнай Камісіі пры Эканамічнай Нарадзе БССР і Члена Вышэйшага Савету Народнае Гаспадаркі БССР.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе: зьняць з тав. Карпешына, Антона Сьцяпанавіча, абавязкі Кіраўніка Беларускай Канторы Дзяржаўнага Банку, члена Эканамічнай Нарады пры СНК БССР, Старшыні Арбітражнай Камісіі пры Эканамічнай Нарадзе БССР і Члена Вышэйшага Савету Народнае Гаспадаркі БССР.

Нам Старшыні Савету Народных Камісараў БССР М. Карклін.

Кіраўнік Сэкраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР М. Мароз.

28 студзеня 1928 г
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Совета Народных Комиссаров БССР

об освобождении тов. Карпешина, Антона Степановича, от обязанностей Управляющего Белорусской Конторой Государственного Банка, члена Экономического Совещания при СНК БССР, Председателя Арбитражной Комиссии при Экономическом Совещании БССР и члена Высшего Совета Народного Хозяйства БССР.

Совет Народных Комиссаров БССР постановляет: освободить тов. Карпешина, Антона Степановича, от обязанностей Управляющего Белорусской Конторой Государственного Банка, члена Экономического Совещания при СНК БССР, Председателя Арбитражной Комиссии при Экономическом Совещании БССР и члена Высшего Совета Народного Хозяйства БССР.

Зам. Председателя Совета Народных Комиссаров БССР М. Карклин.

Управляющий Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР М. Мороз.

г. Минск, 28 января 1928 года.

Хроніка.

У Нар. Кам. Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі

ПАЛЕПШАНЬНЕ ЖЫЛЬЛЁВАЙ КААПЭРАЦЫІ.

Абсьледаваньне жыльлёвай каапэрацыі выявіла вялікую загатоўку будаўнічых матар'ялаў, якія поўнасьцю не скарыстоўваліся, прычым гэтыя матар'ялы няўважліва захоўваліся.

Па параўнаньні з мінулым годам жыльлёвая каапэрацыя ўзрасла на 168 проц. Лепшая якасьць будаўніцтва адзначана ў Гомельскай акруге. Таксама адзначана адсутнасьць вучоты ў крэдытах і вялікая запазычанасьць па Жактах.

Калегія НК РСІ дала канкрэтныя ўказаньні адносна далейшага разьвіцьця будаўніцтва жыльлёвай каапэрацыі і запрапанавала Белжылсаюзу паступова пераходзіць на будаўніцтва мураваных дамоў.

ВЫГАВАР ЗА ЦЕГАНІНУ.

Загадчык грашовай часьці Сьмілавіцкага РВК дапусьціў цеганіну ў справе прадстаўленьня партызану Розіну законных льгот. Льготы Розіну былі прадстаўлены толькі пасьля ўказаньняў НК РСІ. Загадчыку грашовай часьці Сьмілавіцкага РВК за дапушчаную дегаліну абвешчана вымова.

У аб'яднаньні беларускіх пісьменьнікаў „Полымя".

Літаратурныя вечары ў Бабруйску.

Камандыравана група полымяўцаў—Зарэцкі, Вольны, Дудар і Александровіч—у г. Бабруйск, дзе будуць наладжаны тры літаратурныя вечары. Адзін з іх мае быць платным на карысьць бяднейшых дзяцей рабочых і сялян Заходняй Беларусі.

П'есы для вясковага тэатру.

Прыняты Белдзяржвыдавецтвам да друку п'есы-камэдыі В. Сташэўскага для вясковага тэатру: «Мувыкант Цьвілеўскі», «Сьпявай, вясна» і „У прэчы".

Літаратурны дыспут.

У Менску у адным з клюбаў у хуткім часе будзе наладжан літаратурны дыспут на тэму: „Беларускі пісьменьнік і чытач".

Друкуецца раман „Сьцежкі-дарожкі".

Пісьменьнік М. Зарэцкі закончыў раман „Сьцежкі-дарожкі". Раман друкуецца.

ПАШЫРЭНЬНЕ ВЫТВОРЧАСЬЦІ МЕНСКАЙ АБУТКОВАЙ ФАБРЫКІ.

Вытворчая дзейнасьць Менскай абутковай фабрыкі, дзякуючы пераабталяваньню, значна пашырылася.

Так, у мінулым годзе на гэтай фабрыцы было выпрацавана 76.762 пары абутку, а ў гэтым годзе мае быць выпрацавана 112.000 пар абутку.

18.000 руб. на пабудаваньне маслабойных і сыраварных заводаў.

Белсельбанк адпусьціў 18000 руб. на пабудову сыраварных і маслабойных заводаў. З гэтай сумы Магілеўшчыне адпушчана 10000 руб. і Аршаншчыне—8000 руб.

135.000 руб. на набыцьцё корму для жывёлы.

Белсельбанк разьмеркаваў па акругах 135.000 руб. спэцыяльна на фінансаваньне закупак корму для жывёлы. Гэтыя сродкі пераведзены ў рахунак крэдытаў на другі квартал.

Хлеб для беларускай каапэрацыі.

На месяц люты для забясьпячэньня каапэрацыі БССР хлебам выдзелена 125 вагонаў пшанічнай мукі, 80 вагонаў жытняй, 15 вагонаў крупы і 7 вагонаў пшана.

600 бочак селядцоў для каапэрацыі БССР.

Маскоўская кантора Белкаапсаюзу закупіла дадаткова 300 бочак нарвэскіх і 300 бочак ісьляндзкіх селядцоў. Паказаная колькасьць селядцоў закуплена для забясьпечаньня візавой каапэрацыйнай сеткі.

Рост пайшчыкаў і капіталу ў Менскім ЦРК.

За апошні год лік пайшчыкоў Менскага ЦРК узрос з 22995 да 30233 чалавекі, ці на 31 проц. Разам з ростам пайшчыкаў павялічыўся і паявы капітал за год на 58971 руб.

Колькі рабочых было на курортах у 1927 г.

За курортны сэзон 1927 г. з БССР было адпраўлена на курорты: партарганізацыямі—406 чал. і прафарганізацыямі—580 членаў саюзу. Апроч гэтага, Управа Сац. Страхаваньня паслала на курорты 335 членаў прафсаюзу.

Бэтонныя студні ў вёсцы.

Менскі акруговы вямельны аддзел у бягучым годзе мяркуе набудаваць у вёсках Меншчыны 393 бэтонныя студні і 4 буравыя. Праца распачнецца ўлетку. Патрэбныя матар'ялы ў большасьці будуць загатоўлены агнятрывалымі таварыствамі акругі.

Будзе зроблена бясплатна 1000 уводаў электрычнага асьвятленьня.

Гарадзкі савет утварыў камісію для разьмеркаваньня 1000 уводаў электрычнага асьвятленьня ў кватэры рабочых і служачых. Па прадпрыёмствах і ўстановах ужо разасланы анкеты для падачы заяў.

Перавыбары райённых і акруговых саветаў т-ва «Прэч няпісьменнасьць».

Зараз па ўсіх акругах БССР праходзяць перавыбары райённых і акруговых саветаў т-ва «Прэч няпісьменнасьць». Гэтыя перавыбары, згодна пастановы прэзыдыуму Цэнтральнага Савету т-ва, павінны быць закончаны да 1 сакавіка 1928 г.

Праца для працкалектываў БССР.

У дадатак да наряду ВСНГ БССР на бягучы аперац. год у колькасьці 5000 пуд. працы для 3 бесспячэньня тэкстыльных працкалектываў БССР, зараз выдзелена яшчэ 3000 пуд. працы, прычым ужо атрыман наряд на 1000 пуд. працы. Усё гэта дасьць магчымасьць пашырыць панчошную вытворчасьць, галоўным чынам, у Менску і Віцебску.

Савецкая дэлегацыя на савецка-польскую чыгуначную канфэрэнцыю.

У склад савецкай дэлегацыі на савецка-польскую чыгуначную канфэрэнцыю, якая адбудзецца ў Вільні 31 студзеня, уваходзяць: член праўленьня МБЖ чыгунні тав. Рабовіч (старшыня дэлегацыі), начальнік руху МБЖ чыгунні тав. Абушэлі і начальнік руху Паўднёва-Заходніх чыгунак Пушнароў. Дэлегацыя выехала ў Вільню 28 студзеня.

На 2.000.000 руб. будзе рэалізавана прадукцыі.

Маскоўская кантора Белпайгандлю прыступіла да абсаргоўваньня прамысловых каапэрацыйных арганізацый, дробных каапэрацыйных аб'яднаньняў і іншых арганізацый БССР.

Гандлёвы плян канторы прадугледжвае рэалізацыю прадукцыі вышэйзначаных арганізацый на суму до 2.000.000 руб.

1.200 беспрацоўных уцягнуты ў працкалектывы.

Дзякуючы пашырэньню існуючых у БССР працкалектываў і арганізацыі новых, колькасьць занятых у працкалектывах рабочых і служачых значна павялічылася. Так, на 1 кастрычніка 1927 г. у працкалектывах працавала 7894 чал., а на 1 студзеня—8656 чалавек. Апроч гэтага, за 1 квартал 1927-28 аперацыйнага году перададзена мясцовай і дзяржаўнай прамысловасьці 4 прадпрыёмствы з агульным лікам рабочых 439 чал.

Усяго за 1 квартал колькасьць занятых у працкалектывах рабочых павялічылася на 1201 чал. У сувязі з гэткім вялікім пашырэньнем Пар. Кам. Працы БССР стаіць перад плянавымі органамі пытаньне аб павялічэньні нормы водпуску для працкалектываў сыравіны і банкаўскага крэдыту.

ФІЗКУЛЬТУРА і СПОРТ.

На ўсесаюзнае зімовае сьвята фізкультуры.

На ўсесаюзнае зімовае сьвята фізкультуры ў Маскву Вышэйшы Савет Фізкультуры Беларусі накіроўвае 35 чалавек. У калектыў уваходзяць: хакейная каманда, лыжнікі, лыжніцы і канькабежцы (мужчыны і жанчыны). Калектыў складзен з лепшых фізкультурнікаў Менску, Гомеля і Віцебску.

Усебеларускі лыжны прабег.

14 лютага пачнецца ўсебеларускі лыжны ваенізаваны прабег, які арганізуе ВСФКБ.

Прабег гэты мае вялікае значэньне як з боку папуляризацыі лыжнага спорту, так і з боку ваенізацыі.

Зімовыя спаборніцтвы.

19 лютага ў Менску распачнуцца спаборніцтвы па зімовых гаўлях спорту для прафсаюзных гурткоў фізкультуры. Спаборніцтвы адбудуцца па лыжным і канькабежным спорту, на барбэ, падняцьці цяжараў і боксу.

Фізкультуны тэатр.

У Менск прыяжджае першы ў СССР фізкультурны тэатр пад назвай „Оргтеатр". У рэпэртуары тэатру—фізкультурныя атракцыёны, буфанады і апаратты. Гастролі тэатру пачнуцца ў красавіку.

Рознае.

ДВА ГРАМЫ РАДЫЯ—140.000 ДАЛЯРАЎ.

Нядаўна для навуковых устаноў Нью-Ёрку было купілена два грамы радыя за 140.000 даляраў (каля 280.000 руб. на нашыя грошы). Яго хаваюць в асаблівай асьцярогай у адным з нью-ёркскіх шпіталяў у спэцыяльна абсталяваным дзеля гэтага памяшканьні. Два грамы разьмяркованы па 40 шклянных прабірках, якія ў свою чаргу захаваны ў сэйф.

КАСЫ НА КАЛЁСАХ.

Берлінскі гарадзкі банк увёў у сябе цікавую навіну. Кожны вечар спэцыяльныя аўтамабілі-касы абяжджаюць усе берлінскія магазыны і зьбіраюць у касіраў выручку за дзень. Гэта значна аблягчае працу касіраў і вызваляе іх ад стаяньня ў чарзе ў банкаўскіх касах.

МЭХАНІЗАЦЫЯ ГРАМАФОНАЎ.

Адна з буйных амэрыканскіх грамафонных кампаній выпусьціла новую мадэль грамафона, праца якога амаль што цалкам мэханізавана. Досыць адабраць дзесятак патрэбных пластынак і адзін раз завесьці грамафон, і ён будзе іграць нясупынна ў працягу цэлай гадзіны. Гэта мадэль асабліва выгадна для скокаў.

ПОМНІК КАЛУМБУ.

У порце Сант-Дыэго (Амэрыка) будзе пастаўлен аграмадны помнік Хрыстафору Калумбу. Помнік будзе каштаваць 8 мілёнаў руб. На вярху яго будзе ліхтар, прамені якога будуць відаць за 150 кілёмэтраў.

ПРАЭКТ «ЗЬНІШЧЭНЬНЯ ВАЙНЫ»

Дацкі прафэсар Фінбогасун апублікаваў праэкт „зьнішчэньня вайны" праз выданьне закону, на якому кіраўнікі дзяржавы і дэпутаты парляманту, якія абвесьцяць вайну, павінны першымі простымі самадатамі пайсьці на фронт.

НОВАЯ ШКОЛА ДЛЯ ГЛУХАНЯМЫХ.

Пры маскоўскім інстытуце глуханямых пачала практыкавацца „школа хуткага чытаньня з вуснаў". 3-4 месяцы заняткаў, і глухія настолькі хутка чытаюць з вуснаў, нібы па кнізе.

КАЙЛЕПШАЯ МОВА ДЛЯ РАДЫЕВЯШЧАНЬНЯ.

Ня так даўно ў Францыі адбыліся вопыты дзеля вынайленьня прыгоднасьці тэй або іншай мовы ў радыё-перадачах. Самымі лепшымі ў справе радыё-вяшчаньня аказаліся мовы нямецкая і расейская. Яны абедзьве вызначаюцца наліхай чоткасьцю і выразнасьцю гукаў і канчаткаў слоў.

Л. ТЭРМЕН У АМЭРЫЦЫ.

У Нью-Ёрку з вялікім посьпехам прайшло першае выступленьне расейскага фізыка Л. Тэрміна з яго музычным струментам „Тэрменвоксам". Амэрыканскія вучоныя і музыкі далі добрыя водгукі аб гэтым апараце.

КУРС ПА ПЕРАДАЧЫ МАЛЮНКАЎ.

Дзеля надрыхтоўкі радыёспэцыялістых да працы на перадачы малюнкаў па радыё, у берлінскай вышэйшай тэхнічнай школе прафэсар Артур Корн сёлета чытае спэцыяльны курс.

СУДОВАЯ ХРОНІКА.

Задушыла дзіця.

Грамадзянка вёскі Царакі, Лагойскага райёну, Альжбета Бычкоўская 9 чэрвеня 1927 году нарадзіла дзіця і, каб пазбавіцца сорому, задушыла яго і закапала ў гной. Менскі акруговы суд прыгаварыў Бычкоўскую на восем год зьняволеньня, але, прымаючы пад увагу цяжкае матар'яльнае становішча яе, скараціў пакараньне да адзнаго году, а па амністыі ад трыманьня пад вартай вызваліў.

За падлог рахункаў.

Машыніст 1 Менскага гарбарнага заводу, Юрка Максімаў, карыстаючыся службовым становішчам, сам складаў рахункі ад імя розных асоб на праведзеную работу, якая ў сапраўднасьці не праводзілася. Такім чынам, па падложных рахунках Максімаў прысьвоіў 80 р. 15 к. Менскі акруговы суд прыгаварыў Юрку Максімава на год зьняволеньня, але па амністыі ад кары вызваліў.

Апавяшчэньні.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— У сераду, 1 лютага, а 8-й гадзіне ўвечары склікаецца сход асьветнікаў гор. Менску.

АБВЕСТКА ДНЮ:

Даклад сэкратара ЦК КП(б)Б тав. Кнорына аб культурнай рэвалюцыі згодна пастаноў XI зьезду КПБ і XV зьезду УсеКП(б).

Білеты па групкомах і месцкомах.

— Сёньня, 31-1 адбудзецца засяданьны сход ячэйкі КП(б)Б працасьветы.

Пачатак а 7-й гадзіне вечара.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА.

ПРАДАЕЦЦА ЗРЫЎ-ПАПЕРА і СТАРЫЯ ГАЗЭТЫ.
ДАВЕДАЦЦА Ў КАНТОРЫ ГАЗ. «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ» (РОГ ВУЛІЦ — КАРЛА МАРКСА і ЛЕНІНСКАЙ).—

ЗАГАД № 67

ПА ВЫШЭЙШАМУ САВЕТУ НАРОДНАЕ ГАСПАДАРКІ БССР

26 студзеня 1928 г.

За неправастаўленьне ў устаноўлены тэрмін зьвестак аб патрэбнай колькасьці дахавага жалеза і інш. будаўнічых матар'ялаў на 27-28 г. абвяшчаецца вымова кіраўнікам наступных трэстаў і гаспадарчых адзінак, з апублікаваньнем у друку:

1. Кіраўніку Шкляатрэсту—тав. Кострыцу
2. „ Папэртрэсту— „ Якубсону
3. „ Сарніковага трэсту—тав. Дваравецкаму
4. „ Металётрэсту—тав. Фішу
5. „ Скуртрэсту—тав. Кролю
6. „ Вітвоса—тав. Баскіну.

Справа: п. 4 (42) пр-лу пас. Прэз. ВСНГ БССР ад 21-1—28 г. № 16.

Старшыня ВСНГ БССР КАРП.

Нач. Адм. Гасп. Кіраўніцтва ЛУЧЫШЫН.

ВЫШЛА З ДРУКУ ЧАСОПІСЬ
№ 6 „УЗВЫШША" № 6
ЗЬМЕСТ
КУЗЬМА ЧОРНЫ—Сястра—раман. УЛАДЗІМЕР ДУБОЎКА—Кругі—паэма. З. БЯДУЛЯ—Тры пальцы—апавяданьне. ЯЗЭП ПУШЧА—З радкоў «Песьня вайны». Т. КЛЯШТОРНЫ—Калі асядае муць—паэма. А. МРЫЙ—Гармонія ў ружовым—апавяданьне. КРАПІВА—Сваяцтво,—Грамафон (пераклад з украінскае). Ю. ЗЬМСАН—Балота,—Тоўсьніца, Байкапісец і Пакрыўджаныя (пераклад Крапівы з польскае мовы). К. АТРАХОВІЧ—Беларускія прыказкі. А. БАБАРЭКА—Творчасьць Ул. Дубоўкі, як форма нацыянальнай сьвядомасьці пралетарскага характару. Праф. І. ЗАМОЦІН—Расійская мастацкая літаратура. ЗЬМ. СЬНЕЖКА—Баўгарская пралетарская літаратура. КУЛЬТУРА МОВЫ. ВІТ. ВОЛЬСКІ—Аб прыцыпах арабскай транскрыпцыі. УЛ. ДУБОЎКА—Аб слове „аллюстраваць". Р.—Аб слове „кагазе". БІБЛІАГРАФІЯ—Ант. Адамовіч, Ю. Дрэйзін. ХРОНІКА.
Зьмест усіх нумароў „Узвышша" за 1927 год.
„УЗВЫШША" № 1 (7) ЗА 1928 Г. ВЫЙДЗЕ З ДРУКУ Ў КАНЦЫ М-ЦА ЛЮТАГА.
Умовы падпіскі на „Узвышша" на 1928 г.:
на год (6 нумароў)—7 руб., на паўгода (3 нумары)—4 руб. за даплату 3 руб. гадавыя падпішчыкі атрымаюць поўны камплект „УЗВЫШША" на 1927 г. (6 нумароў.).
АДРАС РЭДАКЦЫІ—МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.

ТЭАТР-КІНО.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.
Аўторак, 31 студзеня
„ЦАР МАКСІМІЛЬЯН". Драма ў 2-х дзеях, з інтэрмэдыяй.
Серада, 1-га лютага.
„Каля тэрасы". Народн. драма ў 4-х дзеях з час. 1917 году.
ЗАЧЫНЕНЫ ПАКАЗ ДЛЯ САЮЗУ ХАРЧАВІКОЎ. БІЛЕТЫ ЎСЕ ПРАДАДЗЕНЫ.
Пачатак а 9 гадз.
Нядзеля, 5-га лютага
„Сон у летнюю ноч". Камэдыя ў 3-х дзеях.
Паказ для рабочае моладзі з уступным словам.
ПАЧАТАК А 8 З ПАЛ. ГАДЗ. ВЕЧАРА.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА» „Кто ты такой?"

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". З ПРЫЧЫНЫ ВЯЛІКАГА ПОСЬПЕХУ ПРАДОЎЖАН ЯШЧЭ НА ТЫДЗЕНЬ ПАКАЗ ФІЛЬМЫ „ВАР'ЕТЭ". Трагедыя ў 7-х частках.

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ». „ШЕСТАЯ ЧАСТЬ МИРА". Пачатак сэансаў у 6, 7 з пал., 9 і 10 з пал. гадз. увечары.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ". ГРАНДЫЁЗНАЯ МАСТАЦКАЯ ФІЛЬМА „ЛЕОН КУТЮРЬЕ". ЗВЫШ ПРАГРАМЫ—ХРОНІКА САВКІНО.

на ЛЮТЫ ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА на ЛЮТЫ
на самую папулярную распаўсюджаную беларускую
ГАЗЭТУ „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ" ГАЗЭТУ
ОРГАН Ц. В. К. Б. С. С. Р.
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:
На 1 месяц . . . . . — 90 кап. На 3 м-цы. . . . . 2 р. 70 кап.
„ 2 м-цы . . . . . 1 р. 80 кап. „ 6 м-цаў . . . . . 4 р. — кап.
На год . . . . . 8 руб. — к.
Пачынаючы з лютага, пры газэце пачне выходзіць два разы ў месяц
ЛІТАРАТУРНЫ ДАДАТАК,
ЯКІ БУДЗЕ РАССЫЛАЦЦА ПАДПІСЧЫКАМ БЯСПЛАТНА.
ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: у Менску—у канторы газэты рог вуліц Ленінскай і К. Маркса, у правінцыі—упаўнаважанымі канторы і ўсімі паштова-тэлеграфнымі аддзяленьнямі і аддзяленьнямі Беларускага Дзяржаўнага Выдавец